ПАНЯДЗЕЛАК 20 ЛІСТАПАДА 1933 г. № 267.

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ

Адрас рэдакцыі і канторы: г. Віцебск, плац Волі, Палац працы, 3-ці паверх

ПАДПІСНАЯ ЦЕНА 2 р. у мес. Цана асобн. нумару 8 кап.

Тэлефоны рэдакцыі: Сакратарыят—1-78; нам рэдакцыі, партыйны і касавы сакратары 4-76; сакратары прамысловы, сельска-гаспадарчы—72; рабоч. спабораніцтва і калгаснікаў, сов. будаўніцтва пад культурнага будаўніцтва 6-15, аддзеў рабочых і калгаснікаў, бюро расследаванняў — 2-00 канторы—55; начная рэдакцыя—4-56.

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б, ГАРСОВЕТА І ГАРПРАФСОВЕТА.

СЕННЯ У НУМАРЫ:

Зварот удзельнікаў злёта лепшых ударнікаў—майстраў аўладання новай тэхнікай пры УсеЦСПС да ўсіх рабочых, работніц, ІТР і прафарганізацый Савецкага саюза.

Водгукі замежнага друка на прызнанне СССР Паўночна-Амерыканскімі Злучанымі Штатамі.

ЗАКЛІК МАЙСТРАЎ ПЕРАДАВОЙ ТЭХНІКІ—У ШЫРОКІЯ МАСЫ!

Зварот да усіх рабочых, работніц, ІТР і прафарганізацый Савецкага саюза.

(Прынята на злёце лепшых ударнікаў-майстраў аўладання новай тэхнікай пры УсеЦСПС).

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Наша пролетарская краіна заканчвае першы год другой пяцігодкі. Мы толькі гэтымі днямі адзначалі 16-ы год Кастрычніка, год вяліканых перамог і заваёў, ласягнутых рабочым класам і калгаснікамі пад кіраўніцтвам нашага любімага правадыра тав. СТАЛІНА.

Тав. СТАЛІН на студзеньскім пленуме ЦК УсеКП(б) у першы месяц другой пяцігодкі сказаў нам: „У першы год першай пяцігодкі мы здолелі арганізаваць энтузіязм, пафас НОВАГА БУДАЎНІЦТВА і дабіліся рашаючых поспехаў. Гэта вельмі добра. Але цяпер гэтага не выстарчальна. Цяпер гэту справу павінны мы дапоўніць энтузіязмам, пафасам АСВАЕННЯ новых заводаў і новай тэхнікі, сурёзным узладаннем прадукцыйнасці працы, сурёзным скарачэннем сабекошту. У ГЭТЫМ ЦЯПЕР ГАЛОЎНАЕ".

Ці зразумелі ўдарнікі шахцёры, нафтавікі Баку, металургіі Украіны, Урала і Сібіры тое, што сказаў тав. СТАЛІН? Ці дашлі да нас словы нашага правадыра?

„Ізотаў той, хто і сам добра работае і іншых добра вучыць".

На шахтах Данбаса, Урала, Кузбаса, на нафтапромыслах Баку і Грознага, на металургічных заводах нашай краіны па ініцыятыве лепшага ўдарніка Данбаса забойшчыка НІКІТЫ ІЗОТАВА паднялася шырокая хваля соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва за асваенне тэхнікі механізмаў. Асноўным зместам пачаўшагося руху з'яўляецца барацьба рабочага класа за высокую прадукцыйнасць працы, высокую якасць і нізкі сабекошт прадукцыі. Гэты рух паставіў перад сабою асноўную задачу—шырока перадаваць вопыт лепшых Ізотавых вугаляў, металургі, нафтавікоў усім адстаючым рабочым, якія не асвоілі яшчэ тэхнікі сваёй справы. Сіла прыкладу ў барацьбе за асваенне тэхнікі, перадача лепшага вопыта—вось стрыжань ізотаўскага руху, гэтай новай формы спаборніцтва.

Усномніце словы Нікіты Ізотава на ўсёданецкім злёце ўдарнікаў, скліканым пасля гістарычнага рашэння ЦК УсеКП(б) аб вугалі:

— Не той Ізотаў, хто сам рубае добра. Ізотаў той, хто і сам добра работае і іншых добра вучыць.

Мы, шахцёры Данбаса, ганарымся тым што ізотаўскі рух нарадзіўся ў нетрах нашых шахт, што ён рос і мацнеў ва ўмовах жорсткай барацьбы за выкананне рашэнняў ЦК партыі і СНК, у абстаноўцы барацьбы з сабатажам і канцылярска-бюракратычнымі метадамі работы.

Мы, нафтавікі Баку, скаваныя моцным сяброўствам, ленінскім спаборніцтвам з шахцёрамі Данбаса, ганарымся тым, што першыя асазналі значанне ізотаўскага метада і ўкараняем яго ў нафтапромыслы. Мы горды тым, што лепшы з лепшых нафтавікоў Баку, тав. ВДОВІН, абагацёў ізотаўскі метад рубкі вугаля ўздовжскай сістэмай—перадачай змен на хаду.

Мы ўсе разам ганарымся лепшымі героямі Саюза: шахцёрамі НІКІТАЙ ІЗОТАВЫМ, АНТОНАМ МУРАШКА, СПІРЫДАВЫМ, ВАЛЕЙНІКАВЫМ, ТЕЛЬНЫХ, ГРЫШЫНЫМ; нафтавікамі ЎДОВІНЫМ, АГА-НАЙМАТУЛА, РАБАВЫМ, доменшчыкамі ПОЛЬШЫНЫМ і ГОЛУБЕНКА, сталяварамі КРЭТАВЫМ, КОСЦЕЙ ТРУХАНАВЫМ, ЧЭСНАКОВЫМ і інш.

Гэтыя таварышы на практыцы сваёй работы ў забоі, на нафтапромыслах у буравых, у домнах і мартэнах паказалі, як высока мы можам падняць прадукцыйнасць працы. НІКІТА ІЗОТАЎ І АНТОН МУРАШКА ў чатыры разы перавыконваюць норму. Урубавы машыніст ТЕЛЬНЫХ вырубае 180 пагонных метраў у змену пры норме ў 50. Забойшчык ГРЫШЫН даваў 35 тон, працуючы абушком; зараз работаючы адбойным малатком, дае 85 тон. ВАЛЕЙНІКАЎ перавыконвае норму ў чатыры разы. Шахты Данбаса з крутападаючымі пластамі работаюць удоўжнымі ўступамі па сістэме адбойшчыка СВІРЫДАВА.

Не адстаюць і ізотавы нафты. АГА-НАЙМАТУЛА, буравы майстар Лок-Батана, прабурыў шчыліну ў 24 дні, замест 45 дзён, даных яму на плане Метадамі Ізотава і Вдовіна работаюць лепшыя буравыя майстры Баку: Багда-сараў, Рабаў, Ванесов, Шых-Алі, Сталяроў і інш.

„Воля і энергія большэвікоў робяць цуды".

Так работаюць лепшыя, па праву за служыўшыя імя перадавых змагароў за асваенне новай тэхнікі, і яны-за вядуць за сабою адстаючых, навучаюць навічкоў. Высокія паказальнікі вытворчай работы перадавікоў Донбаса, Баку, Урала цалкам падцвярджаюць словы тав. КАГАНОВІЧА, сказаныя ім на ўсёданецкім злёце ўдарнікаў, што „ВОЛЯ І ЭНЕРГІЯ БОЛЬШЭВІКОЎ РОБЯЦЬ ЦУДЫ".

За 8 месяцаў у Баку створаны сотні ізотаўскіх школ. На шахтах Данбаса, Урала, Кузбаса, Падмаскоўя з'явіліся ізотаўскія ўступы, школы, своеасаблівыя „універсітэты" у забоі. Вугальныя басейны, аснашчоныя багацейшымі механізмамі, на аснове ажыццяўлення гістарычных указанняў тав. СТАЛІНА і рашэнняў СНК і ЦК павышаюць тэмпы работы. Данбас ушчыльную падышоў да 100-процантнага выканання плана. У параўнанні з мінулым годам за апошнія месяцы здабыча вугаля ў Данбасе вырасла на 30—35 проц. Нафтавыя промыслы Баку ў мінулым годзе давалі ў суткі 33 тыс. тон нафты, а ў лістападзе гэтага года—55 тыс. тон. У 1932 г. сярэдняя месячная выплаўка чыгуна складала 517 тыс. тон, а сярэднямесячная выплаўка за 8 месяцаў 1933 г.—560 тыс. тон. У мінулым годзе сярэднямесячная выплаўка сталі складала 490 тыс. тон, а ў кастрычніку бягучага года—ўжо 670 тыс.

Выканаем план па вугалю, металу і нафце.

У нас ёсць велізарныя дасягненні. Гэта добра. Але гэтыя дасягненні нас далёка не задавальняюць.

Шахцёры вугальных басейнаў! Вы яшчэ не забяспечылі 100 процантнае выкананне плана. Вы яшчэ дагэтуль у даўгу ў пролетарскай дзяржавы. Вы яшчэ не пакончылі з расхляба-насцю ў рабоце. На вашых шахтах надта нізка працоўная дысцыпліна, многа прагулаў. На многіх шахтах шахцёры не работаюць поўных 6 гадзін і нярэдка рабочы дзень складае не больш 3—4 гадзін. Кожнаму рабочаму нашай краіны добра вядома, якія велізарныя расурсы мае Данецкі басейн, на механізацыю якога совецкі ўрад затраціў мільярды руб. Ваш доўг, таварышы шахцёры, у гэтым годзе выбыць на-гара УСЕ 84—МІЛЬЁНЫ тон вугаля. НІВОДНАЙ ТОНАЙ МЕНШ!

Таварышы металургі!

Многа недахопаў існуе і ў вашай рабоце. Надта нізкая працоўная дысцыпліна і яўна нездавальняючае скарыстанне рабочага часа мае месца і ў вас. За гэты год металургія абагацілася новымі першакласнымі на тэхніцы вытвараннямі домнамі і мартэнамі, а між тым план вы не выконваеце. Ку-ды гэта варта, калі дзве першыя доменныя печы Магнітагорскага металургічнага завода даюць не больш 800 тон чыгуна ў суткі, у той час, калі трэцяя, роўная па магутнасці з першымі домнамі, дае ўжо 1200 тон у суткі? Пара вам, таварышы металургі, пакончыць з адставаннем. Метадамі лепшых доменшчыкаў Саюза Польшына і Голубенка металамі лепшых сталяраў Чэснакова, Крэтава і Труханава вы сокаўзнімайце прадукцыйнасць працы, ашчыльніце поўнасцю рабочы дзень, дайце высокую якасць прадукцыі. Усе 420 мінут работайце як большэвікі ў домнаў, у мартэнаў, у прокатах, у цэхах. Дабейцеся выплавкі 26 ТЫС. ТОН ЧЫГУНА Ў СУТКІ. НІВОДНАЙ ТОНЫ МЕНШ!

Таварышы нафтавікі!

Бакінцы дабіліся вялікіх поспехаў. Яны ўжо перавыконваюць план і змагаюцца за здабычу мільёна тон нафты звыш гадавога задання. АЛЕ ГРОЗНЫ ЗНАЧНА АДСТАЕ ГЭТА ГАНЬБА ДЛЯ ГРОЗНЕНСКІХ РАБОЧЫХ. Вы ж, таварышы грозненцы, таксама як і бакінцы, спаборнічаеце з шахтамі Донбаса. Дакажыце-ж на справе вашу здольнасць ісці ў радах перадавых работнікаў. ПАДЦЯГНІЦЕСЯ! Поўнасцю выканайце план злабычы першага года другой пяцігодкі. Поўнасцю рэалізуйце план па буравані.

Ізотаўскі рух—новая ступень ленінскага спаборніцтва.

Мы, ударнікі новай тэхнікі звяртаемся да прафсаюзных арганізацый з заклікам узначаліць і моцна кіраваць ізотаўскім рухам, які з'яўляецца часткай ленінскага спаборніцтва. Не ўсе яшчэ прафарганізацыі ўразумелі значэнне гэтага руха перадавых змагароў нашай прамысловасці, не ўсе яшчэ арганізуюць сапраўднае масавае навучанне рабочых ізотаўскаму майстэрству (шахта «Чырвоны Прафінтэрн»—Рыкава, шахта 4—2—біс—Казіеўка і інш.). Ізотаўскі рух, як правіла, яшчэ не пастаўлен у цэнтр увагі масававытворчай работы прафарганізацый. Выяўляйце ж Ізотавых на сваіх прадпрыемствах! Арганізуйце навучанне адстаючых, правядзіце „дні Ізотавых" шырокія таварыскія сустрэчы для абмена вопытам! Скліканьце ўсесаюзны злёт Ізотавых па асобных галінах прамысловасці!

Мы звяртаемся з заклікам да ўсіх прафарганізацый: РАЗГАРНІЦЕ СПАБОРНІЦТВА НА ШЫРОКАЕ УНЯДРЭННЕ Ў ПРАКТЫКУ РАБОТЫ ЎСІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ІЗОТАЎСКІХ МЕТАДАЎ. Гэта соцыялістычнае спаборніцтва павінна забяспечыць бязумоўнае выкананне ўсімі прадпрыемствамі і галінамі прамысловасці вытворчага задання і пераможнага завяршэння першага года другой пяцігодкі. Мы высоўваем ў якасці арбітра гэтага спаборніцтва прэзідыум УсеЦСПС.

Мы заклікаем увесь наш друк—„ТРУД", „ЗА ИНДУСТРИАЛИЗАЦИЮ", „ИЗВЕСТИЯ", „КОМСОМОЛЬСКУЮ ПРАВДУ", абласныя і рабочыя газеты—па прыкладзе „ПРАВДЫ", ГОРТАЎСКАЙ „КОЧЕГАРКИ" і БАКІНСКАЙ „ВЫШКИ" шырока асвятляць вопыт лепшых узораў ізотаўскага руха і ход соцыялістычнага спаборніцтва паміж прадпрыемствамі за ўзядрэнне ізотаўскага метада.

У нас ужо ёсць некаторы вопыт работы з дапамогай новых метадаў, гэты вопыт павінен стаць здабыткам кожнага рабочага. Мы просім УсеЦСПС выпусціць спецыяльныя інструкцыі—памяткі работы і арганізацыі працы лепшых ударнікаў—Нікіты Ізотава, Мурашка, Свірыдава, Валейнікава, Тельных, Вдовіна, Ага Найматулы, Польшына, Крэтава і інш. Гэтыя памяткі трэба давесці да кожнага рабочага. Яны павінны абгаварвацца на вытворчых нарадах, быць дапаможнікамі на курсах тэхнічнага мінімума, у гуртках тэхвучобы, у яйках ЗАТ.

Нехай па памятцы Тельных вучацца ўсе ўрубмашыністы Саюза. Яны павінны вучыцца самі і вучыць іншых. Нехай памятка бурыльшчыка Ага-Наймутулы навучыць рэкордным тэмпам буравання ўсіх буравых майстраў Совецкага саюза.

Прафсаюзы! Узначальце творчую актыўнасць рабочых мас!

Мы звяртаемся да прафсаюзных арганізацый з другім паграбаваннем: ЯШЧЭ БОЛЬШ І ЛЕПШ ЗАЙМІЦЕСЯ КУЛЬТУРНА-БЫТАВЫМ АБСЛУГОЎВАННЕМ РАБОЧЫХ, бо барацьба за асваенне высокай тэхнікі, за авалоданне механізмамі павінна спалучацца з барацьбой за чыстае жыллё, з ліквідацыяй бруду і бескультур'я ў рабочых пасёлках і гарадах. У гэтых адносінах и абходна шырока ўнядрыць вопыт горлаўкі.

ТАВАРЫШЫ ГАСПАДАРНІКІ І ІНЖЫНЕРНА-ТЭХНІЧНЫЯ РАБОТНІКІ!

Па ініцыятыве лепшых ударнікаў высунуты новыя формы арганізацыі працы. Аднак многія гаспадарнікі яшчэ недаацэньваюць гэтых метадаў работы і не паклалі іх у аснову карэннай змены і паляпшэння арганізацыі працы. Сярод інжынерна-тэхнічных работнікаў маецца таксама нямала Ізотавых, але іх вопыт вядомі марудна асвойваецца і не падхопліваецца. Вы датны вопыт інжынера Валадарскага з дэспетчарызацыяй не знайшоў яшчэ шырокага прымянення на шахтах Данбаса. Мы заклікаем вас, таварышы гаспадарнікі ак заць самую шырокую дапамогу развіццю ізотаўскага руха сярод рабочых і ІТР. Арганізуйце ізотаўскія школы, ізотаўскія ўступы, ізотаўскія промыслы і буравыя. Праз гэтыя школы, цалкам сябе адраўдаўшыя, працу скайце кожнага новага рабочага.

РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ СОВЕЦКАГА САЮЗА! Умацоўвайце рады ізотаўцаў на сваіх прадпрыемствах. Арганізуйце ізотаўскі рух на калгасных і совгасных палях.

Тав. МОЛАТАЎ у сваім дакладзе 6 лістапада сказаў:

«Творчая работа ў нашай краіне ідзе на ўздым ва ўсіх галінах. Расце лік ініцыятыўных, самадзеяных людзей, з поспехам спраўляючыхся з новымі трудніцкімі задачамі».

І гэта верна.

Умножым рады ініцыятыўных і самадзеяных людзей! Шырэй размах спаборніцтва і ізотаўскага руха—новага моцнага аружжа ў барацьбе за асваенне тэхнікі! Выканаем поўнасцю заданне першага года другой пяцігодкі. Выдадзім на—гара 84 млн. тон вугаля, дадзім дадаткова мільён тон нафты па Баку, выканаем поўнасцю план здачы нафты па ўсім Саюзе, дабіўшыся выплаўкі 26 тыс. тон чыгуна ў суткі!

Ахопім спаборніцтвам і пафасам асваення кожнага рабочага і работніцу, кожнага калгасніка і калгасніцу нашай пролетарскай краіны! Ажыццявім у найкарацейшы тэрмін пастаўленую т. Сталіным задачу—АСВОІЦЬ ВЕЛІЗАРНЫЯ БАГАЦЦІ, СТВОРАНЫЯ Ў СССР.

СЛЕДУЕ 40 ПОДПІСАЎ, УЛІКУ ІХ: НІКІТА ІЗОТАЎ, ВДОВІН, АГА НАМАТУЛА, МУРАШКА, СВІРЫДАЎ, ВАЛАДАРСКІ, ЧЭСНАКОЎ І ІНШ.

Санітарнаму дэкадніку—большэвіцкія тэмпы!

Сёння шосты дзень ударнага санітарнага дэкадніка.

У КОЖНЫМ доме арганізуем СУБОТНІК па навядзенні чыстаты.

ПРЫКЛАД ЖАКТА № 21 НЕАБХОДНА ШЫРОКА ПАДХАПІЦЬ УСІМ ЖАКТАМ І ДОМАКІРАЎНІЦТВАМ.

ШЫРОКА АРГАНІЗУЕМ СУБОТНІКІ БАРАЦЬБЫ ЗА ЧЫСТАТУ.

Сёння — шосты дзень ударнага санітарнага дэкадніка, абвешчанага гарсоветам. За шэсць дзён прахаджэння гэтага дэкадніка асобныя жакты (жакты 10, 12, 21) паказваюць сапраўды ўзорныя прыклады барацьбы за ўкараненне чыстаты і гігіены ў кожнай кватэры.

Мы з усёй рашучасцю павінны звярнуць увагу на тым каштоўным пачыне, які пачало праўленне жакта № 21. Па гэтаму жакту праведзены тры суботнікі саміх жыхароў, якія прайшлі пад знакам ачысткі жактаўскіх двароў ад смецця і бруда. Гэтыя суботнікі гаворяць аб тым, як шырока паднялася ініцыятыва і самадзейнасць саміх жыхароў. Гэтыя суботнікі даюць адпор усякім ныцікам і малаверам, якія сцвярджаюць, што няма магчымасці вывезці мусар, няма сродкаў і інш., г. зн. выяджаюць на аб'ектыўных прычынах, як гэта спрабуюць рабіць старшыня жакта № 15 Магідаў і кіраўнік дамамі Кудраўцаў. Апошнія нават не склікалі ніякіх сходаў жыхароў, не абгаварылі з імі пытанне аб ачыстцы жактаўскіх двароў ад мусара і бруду, не арганізавалі увесь жактаўскі актыў на барацьбу за чыстату і толькі ў гэтым трэба шукаць прычыну забруджання двароў і асобных кватэр у жакце № 15, бо без самадзейнасці саміх жыхароў, без іх творчай ініцыятывы нельга дабіцца поўнага ажыццяўлення санітарнага максімума. І вось таму задача заключаецца ў тым, каб усе жакты як адзін арганізавалі суботнік жыхароў на барацьбу за чыстату, за ачыстку жактаўскіх двароў і кватэр ад грязі мусара і хлама. Трэба шырока скарыстоўваць вопыт жакта № 21.

Трэба асабліва падкрэсліць, што ўдарны дэкаднік яшчэ не ўзварушыў інвэнтасць і коснасць работнікаў лазняў, у якіх парушаецца санітарны максімум. Яркім прыкладам гэтага з'яўляецца лазня № 2., матэрыял аб якой мы сёння змяшчаем. Загадчык лазні № 2 Крэслаўскі дарэмны член партыі літаральна палец аб палец не ўдарыў, каб ліквідаваць недахопы ў лазні, фактычна сабатуючы справу навядзення парадка і чыстаты.

Гаркамгас (т. Драгун) павінен зараз-жа ўзяцца за справу навядзення чыстаты ў лазнях, прыцягваючы канкрэтных вобітаў зла да суровай адказнасці.

Кожная лазня павінна паказаць узоры ажыццяўлення санітарнага максімума.

А РАПАПОРТ З ХАЙКІНЫМ СПРАЧАЮЦА...

Санмаксімум не адчуваецца ў цэхах фабрыкі імя Лекерта.

На фабрыцы імя Лекерта ў час праведзення сталінскага пахода на арганізаванай сустрэчы зімы дабіліся некаторых дасягненняў у справе рамонта кватэр на зіму. Адрамантаваны кватэры наступных рабочых фабрыкі: ШВАЙНШТЭНА, БАШКІРА, ВУЛЬФОВІЧА (герой пяцігодкі), ЯЛАВА. 50 рабочым выдана шкло для ашклення вакон, 113 ударнікаў забяспечаны дастаўкай дроў на дом і інш.

Аднак, побач з такой работай, на фабрыцы імя Лекерта запамяталі аб тым, што патрэбна сурёзная работа па ажыццяўленні санітарнага максімума ў кожным цэху, у кожнай рабочай кватэры. У прыбіральных фабрыкі і ў цэхах брудна. Элементарныя правілы санітарыі не ажыццяўляюцца. У цэхах дагэтуль няма вентыляцыі. Сама фабрыка сустракае зіму непадрыхтаванай: печы не адрамантаваны. Ідуць гарачыя спрэчкі паміж сакратаром партканцтвы Рапапортам і дырэктарам фабрыкі Хайкіным. Першы кажа, што трэба рамантаваць печы, а другі ўпіраецца, кажа, што непатрэбна. А пакуль паміж імі ідуць спрэчкі—у цэхах стаіць холад.

Трэба пакласці канец апартуністычным разважанням і ўзяцца сурёзна за справу падрыхтоўкі усёй фабрыкі да зімы.

АБРАМЗОН.

21 лістапада, а 7 гадзіне ўвечары, у гарКК РСІ (кабінет старшыні) скліканца

НАРАДА ПА ПЫТАННІ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА БУДАЎНІЧАГА СЕЗОНА 1934 г.

На нараду абавязаны з'явіцца прадстаўнікі ўсіх арганізацый, якія будуць праводзіць жылёвае, камунальнае, культурна-бытавое будаўніцтва, кіраўнікі будаўнічых арганізацый і іх тэхнарукі, галоўныя бухгальтары будуючыхся і будаўнічых арганізацый. Запрашаюцца прадстаўнікі гарплана.

Старшыня гарКК—РСІ АВЕРЫН.

Дошка ганьбы

сабатажнікаў і зрыўшчыкаў барацьбы за санітарны максімум,

7. Крэслаўскі—загадчык лазні № 2—дапусціў антысанітарыю і беспарадкі ў лазні.
8. Магідаў—старшыня жакта № 15—не гледзячы на рад штрафаў, накладзеных на яго міліцыяй за антысанітарнае станоўішча жактаўскіх двароў, працягвае дапускаць агідную антысанітарыю ў жактаўскіх дварах і кватэрах.
9. Кудраўцаў—упраўдамамі жакта № 15—таксама бяздзейнічае і не прымае мер да ліквідацыі антысанітарыі ў жакце.

Галярэя „гразнюх".

СЁННЯ ПАКАЗВАЕМ „ГРАЗНЮХ" З ЖАКТАЎ №№ 16, 21 І 12.

У ЖАКЦЕ № 16 *гразна трымаюць свае кватэры* **Вінчук,** (*праж. па Чырвонай плошчы, 12*) *працуючая на фабрыцы „Сцяг індустрыялізацыі"*; **Хейкін**—(*Чырвоная плошча 12, „Сцяг індустрыялізацыі"*), **Новікаў**—(*Пянерская № 3, прадавец у Беляндзі*) *у яго кватэры труба парушаюцца элементарныя правілы гігіены. Бруд тоўстым пластом пакрыў сцены і падлогу яго жылля.*

У ЖАКЦЕ № 12 *гразна і антысанітарна трымаюць свае кватэры пайнікі* **Сонцаў, Віндугерская,** (*праж. па Совецкай вул. д. № 16*). **Абламунец, Каган і Капланскі** (*праж. па Ленінскай вул. д. № 21*)

У ЖАКЦЕ № 21 *злосна парушаюць санітарны максімум жыхары* **Гаев, Шчербакова, Віхар З., Бейлінсон** (*Вагзальная дом № 34*), **Шагалава, Бейлінсон, Шнейдэрман** (*член рэвізійнай камісіі жакта*). (*праж. па Вагзальнай вул. д. № 32*)

Вось яны, канкрэтныя носьбіты зла, канкрэтныя парушальнікі ажыццяўлення элементарных правіл гігіены і чыстаты.

У бліжэйшы жа дзень гэтыя жыхары павінны забяспечыць прывядзенне сваіх кватэр ў санітарны стан з тым, каб быць знятымі з ганебнай галярэі «гразнюх».

Лазня, якая абрасла тванню бруда і антысанітарыі.

Уваходзім ў лазню № 2. Пры ўваходзе брудна і маюцца хворыя. Абслугоўваючы персанал ходзіць без халатаў.

Падлога і скамейкі брудныя. Вада для піцця ўтрымліваецца не ў зачыненым баку, альбо ў іншым сасудзе, а тут жа на скамейцы, дзе раздзеваюцца і надзеваюцца стаіць гліняны куўшынчык, нават вічым не накрыты і маецца ўсяго адна шклянка, якая пераходзіць з рук у рукі.

На нашу заўвагу, чаму так неахайна ўтрымліваецца вада, тав. ПЯТРОВА скарэдзіцца, што ніякага перададу ў рабоце лазні няма і аглядваючыся па бакам з просьбай „не выдаваць яе перад загадчыкам лазні Крэслаўскім", па «сакрэту» яна нам паведамляе, што яна сама баіцца піць гэту ваду, бо гатавалася яна ў хаце, купцы білетаў чарга. Таўкатня.

Усё гэта гаворыць, што ў лазні, дзе асабліва важна ўтрыманне чыстаты, выкананне санітарнага максімума, пануе бруд і антысанітарыя, што загадчык лазні, член партыі Крэслаўскі і групком пажарнікаў, які аб'яднае работнікаў лазні, праяўляюць самыя злачынныя адносіны да пытанняў санітарыі, праяўляюць сабатаж у ажыццяўленні санітарнага максімума. Патрэбны самыя неадкладныя захады, каб навесці чыстату ў лазні, а за ўсе ўказаныя вышэй факты загадчык лазні Крэслаўскі павінен быць прыцягнут да адказнасці.

М.

ЗРАБІЦЬ ВУЛІЦЫ ЧЫСТЫМІ, ВАРТЫМІ НАШАГА ПРОЛЕТАРСКАГА ГОРАДА.

„Ад нас, дворнікаў, залежыць чыстата вуліц і двароў".

Мы, дворнікі нясем вялікую адказнасць за санітарнае станоўішча вуліц, двароў. І гэта адказная работа, на якую мы пастаўлены, патрабуе ад нас сумленнага і акуратнага выканання нашых абавязкаў.

Я работаю дворнікам у жакце № 4. Агульная плошча, якую я павінен падмесці, складае 2600 кв. метраў. Сюды ўваходзяць пяць двароў і вуліцы: Сталярная, Гогалеўская, Бязбожная і завулак Крапоткіна. Я добра ўявіў сабе, што я штодзённа і добраякасна павінен выконваць свае абавязкі. Мой рабочы дзень пачынаецца штодзённа з 5 гадз. раніцы і работаю да таго часу, пакуль усюды добра падмяту, пакуль вуліцы і двары прымуць чысты і акуратны выгляд. Калі я падмятаю вуліцы, я ніколі не паўдаю да вечара груды смецця, а адразу ж пасля падмятання вуліц збіраю яго і знашу ў яму. За час сваёй работы я ніколі не меў ніякіх заўваг ад жакта і міліцыі. За маю добрасумленную ударную работу мяне прэміравалі у час Кастрычніцкіх свят. Вось чаму я жадаю праз газету „Віцебскі пролетарый" сказаць, што ў час санітарнага дэкадніка на нас, дворнікаў, ускладзены асабліва адказныя абавязкі, якія мы павінны выканаць з гонарам. ЗРАБІЦЬ ВУЛІЦЫ ЧЫСТЫМІ, ВАРТЫМІ НАШАГА ПРОЛЕТАРСКАГА ГОРАДА ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС САМІХ, АД НАШАЙ ДОБРАСУМЛЕННАЙ РАБОТЫ, АД НАШАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАННЕ САНІТАРНАГА МАКСІМУМА.

Я лічу, што ў час гэтага дэкадніка, які абвешчан гарсоветам, усе дворнікі павінны паказаць сапраўды ўдарныя узоры работы, каб прывесці наш горад у чысты і прыгожы выгляд.

Дворнік ЛЕЙЗОВІЧ.

ЦІТОЎ ЦІМОХ—член праўлення жакта № 12, упаўнаважаны домам, дапускае забруджванне жактаўскага двара адкідамі і смяццём. Яго маці замест таго, каб ліць памыі ў смяццёвую скрыню, ліе іх каля гэтай ямы.

„Чыстата" па Цітаву.

ХРОНІКА САНІТАРНАГА ДЭКАДНІКА.

* ЖАКТ № 15—САМЫ ГОРШЫ ў ажыццяўленні санітарнага максімума па 1-му раёну. Праўленне жакта неаднаразова было аштрафавана, аднак бруд ва дварах і жактаўскіх кватэрах працягваецца. 1-е аддзяленне міліцыі аддала пад суд кіраўніка дамамі жакта КУДРАЎЦАВА і старшыню праўлення жакта МАГІДАВА.

* У ЧАС ДЭКАДНІКА ЎЗОРЫ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ САНІТАРНАГА МАКСІМУМА паказвае кафе закусачная (Ленінская № 3). Адміністрацыя гэтай закусачнай прыняла ўсе меры, каб захоўваць чыстату і гігіену ў кафе. Калі ўваходзіш у кафе, то адчуваеш, што ўсюды чыстата і ўтульнасць.

* ШЫРОКА Ў АСОБНЫХ ЖАКТАХ разгарнуўся паход за чыстату і гігіену.

* У ЖАКЦЕ № 24 ПРАВЕДЗЕНЫ ТРЫ СУБОТНІКІ. Два суботнікі праведзены па Вагзальнай вул. па дому № 20 па ініцыятыве пайніцы Блох адзін суботнік праведзен па ініцыятыве члена праўлення жакта т. Собалева і на жактаўскім дварэ па Вагзальнай вул. № 34, дзе сіламі жыхароў вывезена 50 коек мусара і бруду.

* 15 ЛІСТАПАДА Ў КЛУБЕ „ПРАФІНТЭРН" У ПАКАЗАЛЬНЫМ ПАРАДКУ была заслухана справа па абвінавачанні ў парушэнні санітарнага максімума старшыню жакта № 5 ГОРДЗІНА і кіраўніка дамамі гэтага жакта КАЛЮЗІНА, якія не прымалі ніякіх мер па ачыстцы жакта ад бруда і антысанітарыі. Т ксама была заслухана справа загадчыка хлебапякарні 1—4 Ліцкага, які дапусціў і насаджаў бруд у месцы выпечкі хлеба.

Суд прыгаварыў кардамамі № 5 КАЛЮЗІНА—да пазбаўлення волі на тры гады, старшыні жакта № 5 ГОРДЗІНА — год прымусовай працы, ЛІЦКАГА—да пазбаўлення волі на два гады.

Чыстата і парадак у 20 ФЗС.

Належны парадак і чыстата ўведзена ў 20 ФЗС. Падлога заўжды чыстая, падмятаецца па некалькі разоў на дні. Класнае абсталяванне таксама знаходзіцца ў чыстаце. Дошкі, скамейкі, вокны выціраюцца чыстай трапачкай да і пасля заняткаў.

Класныя памяшканні ўсе да аднаго праветрываюцца, прычым робіцца гэта па некалькі раз на дні.

У карыдоры знаходзяцца бачкі, якія напоўнены гатаванай вадой і ўтрымліваюцца ў поўным парадку.

Пасуда мыецца толькі гатаванай вадой па некалькі разоў. Вучні перад снеданнем заўжды мыюць рукі. Для кожнага вучня ёсць асобныя салфетачкі, якімі ўсе выціраюць перад снеданнем рукі.

У класах цёпла і ўтульна. Зараз вучні азеляняюць школу кветкамі.

Па ўсіх групах праводзяцца гутаркі аб санітарным максімуме. Санітарная секцыя, якая арганізавана пры школе, акуратна сачыць за чыстатой груп і кожнага вучня.

ШОЛАМАВА.

Спаборніцтва чатырох раёнаў на лепшую пастаноўку партвучобы.

ВЫСОКАЯ ЯКАСЦЬ ВУЧОБЫ—ПЯРВЕЙШАЯ ЎМОВА НА ПРАВА АТРЫМАННЯ ПЕРАХОДНАГА СЦЯГА ГК КП(б)Б.

Шырока разгорнем індывідуальнае спаборніцтва выкладчыкаў сеткі партасветы на ўзорную падрыхтоўку да сваіх лекцый, на лепшую засвойваемасць слухачамі пройдзенай праграмы.

БОЛЬШ ГАДЗІНЫ СТРАЧАНА НА АГУЛЬНЫЯ СЛОВЫ І ФРАЗЫ.

Слухачы кандыдацкай школы групы «А» фабрыкі «ДЗВІНА» сабраліся з невялікім спазненнем.

У 3 гадзіны 40 мінут заўшоў кіраўнік школы т. СУШАНКОЎ і ўсе пачалі рассаджвацца... Пачынаюцца заняткі.

Выяўляецца, што слухачы не ведалі тэмы, бо не атрымлівалі задання і таму ніхто з іх да заняткаў не рыхтаваўся.

— Значыцца мне самому прыдзецца гаварыць—пачаў т. Сушанкоў, шукаючы ў падручніку матэрыял...

Сёння ў вас прапег тэмы: „ШТО ТАКОЕ КОМУНІЗМ І СОЦЫЯЛІЗМ“.

Мы, праўда, ужо распрацавалі гэтую тэму, але не вычарпальна. Дык вось слухайце.. І т Сушанкоў пачаў тлумачыць розніцу паміж соцыялізмам і комунізмам. Але замест чоткага і яснага растлумачэння атрымаліся агульныя фразы: „Ніжэйшая форма комунізма—соцыялізм павінна абагуліць, пераработаць матэрыял, падрых таваць умовы для комунізма“... Скончыўшы „тлумачэнне“ ён запытаў:

Тут што мы бачым?—Запытаў Сушанкоў слухачоў. Замест адказа слухачы яшчэ больш напружана пачалі лавіць словы, якія адно за адным відаў Сушанкоў. Яны імкнуліся зразумець сэнс таго, аб чым спяшаючыся тлумачыў кіраўнік, але гэта было даремна. Зразумець Сушанкова не прадставлялася магчымым. Набора агульных слоў і фраз—вось з чаго складалася «лекцыя».

А пытанне Сушанкова—«ШТО МЫ БАЧЫМ», так і засталося пытаннем без адказа. З самага пачатка лекцыі сказалася тое, што кіраўнік з'явіўся непадрыхтаваным да заняткаў, толькі-б запоўніць час лекцыі.

— Пролетарыят адняў фабрыкі і заводы, атрымаўшы ў спадчыну не культурную гаспадарку, рэшткі класаў(!?) і вось пролетарыят павінен усё пераарацаваць..

Аб якіх гэта рэштках класаў тлумачыць слухачам кіраўнік? Хіба ж толькі рэшткі класаў існуюць у перыод дыктатуры пролетарыята? Дзе-ж асноўныя класы: пролетарыят і працоўнае сялянства—цесны саюз і правільныя ўзаемаадносіны якіх, вырашаюць лёс пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Закрануўшы пытанне аб класах патрэбна было растлумачыць слухачам, якія ў нас зараз асноўныя класы і якія рэшткі класаў існуюць у пераходны перыод. Але замест гэтага Сушанкоў даў палітычна няправільнае тлумачэнне.

Адмяраючы клас не ўступае нам месца—працягваў Сушанкоў, а ўсё гэта патрабуе ўзмацнення дыктатуры пролетарыята і вось нам, як кандыдацкай школе трэба гэта зразумець, што эпоха дыктатуры пролетарыята павінна знішчыць традыцыі..

А дакладней, падрабязне, што знішчыць, як знішчыць, якія традыцыі на гэтым пытанні слухачы адказа та і не атрымалі, а далей ад кіраўніка яны чулі:—дыктатура пролетарыята выражана ў форме совецкай улады, яна мае тры асноўных зелачы і мы гэтыя асноўныя задачы павінны зразумець. Не даў Сушанкоў тлумачэння, а толькі папярэдзіў, што трэба „зразумець“ і далей працягваў—«каб адказаць сабе справаздачу ў той хлусні якую ўзводзяць на дыктатуру пролетарыята нашы класавыя ворагі»..

Злоў такі колькі агульныя словы, замест таго, каб канкретна, зразумела растлумачыць слухачам хлусню, паклёпы, якія ўзводзяць нашы ворагі на дыктатуру пролетарыята, на совецкі саюз у сваіх антысовецкіх, контрэволюцыйных мэтах. Усё гэта можна і патрэбна было паказаць на канкрэтных прыкладах з апошніх падзей, якімі насычаны газеты, наш пролетарскі друк, а не гаварыць наогул.

Так прайшло больш гадзіны. Што карыснага атрымаў слухач ад гэтых заняткаў? Нічога! Такія заняткі не толькі не карысны, але шкодны. Мы з'яўляліся сведкамі таго, як на гэтых-жа заняткох у т. Сушанкоў з 15 чалавек, агульнага ліку прысутнічаючых, у канцы заняткаў 5 чал. смачна спала, а астатнія змагаюцца са сном сядзелі і прыдавалі від быццам слухалі. Ясна, што пасля некалькіх такіх заняткаў заведвець лекцыі тав Сушанкова мала знойдзецца ахвотнікаў.

* * *

Заняткі ў групе «А» кандыдацкай школы фабрыкі «Дзвіна», якія намі вышэй паказаны адбыліся ўсяго некалькі дзён таму назад. Гэта тым больш не прасцідельна, пасля рашучага папярэджання бюро гаркома партыі аб неабходнасці і ўзняцця ЯКАСЦІ ўчобы ў сетцы партыйнай асветы.

У выніку непадрыхтаванасці давалісь нават палітычна шкодныя тлумачэнні. Вінават не толькі Сушанкоў, але і т. ФІНКЕЛЬШТЭЙН (загадчык культпропа партканцэлярыі), які добра ведаючы, што Сушанкоў да заняткаў не падрыхтаван, дапусціў яго кіраваць школай.

Заняткі у групе „А“, якія праводзіў Сушанкоў паказчык таго, што на фабрыцы «Дзвіна» не змагаюцца па большэвіцку за павышэнне ЯКАСЦІ вучобы і гэтым самым знижаюць інтарэс слухачоў да заняткаў.

Тут няма яшчэ барацьбы за выканне пастановы бюро гаркома партыі аб шырокім разгортванні соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў партвучобе, за заваяванне першынства ў спаборніцтве чатырох раёнаў на лепшую пастаноўку партвучобы. Так таварышы з партканцэлярыі «Дзвіны» нельга змагацца за пераходны сцяг гаркома партыі. Якасць партвучобы павінна быць рашуча ўзнята. М. АРЛОЎСКІ.

Умелая арганізацыя заняткаў вырашае поспех лекцыі.

Тры гадзіны дня. Гудок. Сёння дзень партвучобы. А палове чацвёртай аўдыторыя совпартшколы групы „Б“ фабрыкі «Дзвіна» напаўняецца слухачамі.

Многія паспелі перакусіць тут-жа ў буфеце пры сталоўцы. Час пачаць заняткі. Але аказваецца, што кіраўнік па палітзанятках ГАРБАЧЭЎСКІ (з педтэхнікума) не прышоў.

Загадчык культпропа калектыва т. ФІНКЕЛЬШТЭЙН абвяшчае, што замест палітзанятак будзе географія.

На стале павяшаецца глобус. На лошцы заняла месца карта ЭЎРОПЫ. Але...аказалася, што і выкладчык па геаграфіі не з'явіўся Слухачам разделі кніжкі „ГІСТОРЫЯ УсеКП(б)“ Папова для апрацоўкі тэмы: «ПЕРЫОД „ІСКРЫ“.

Слухачы разбіліся на тры групы і пачалі чытаць Карысці ад гэтага было мала. Групы чыталі голасна і перашкаджалі адна другой.

Пасля паспрабавалі абгаварыць прачытанае. Атрымалася бытавіна. Ні на адно пытанне не маглі як след адказаць, бо галоснай групавой чытай тэма фактычна не была распрацавана. Некалькі раз пачынаў ЛАПАЦІН, працягвала т. ХОБЕЦ, на рэшце ўсё гэта надакучыла і брыгадзір чосальнага цэха СТАРАВОЙТАВА перастала слухаць, адвярнулася КІЗНЕЧЫК яшчэ з адным закурылі і размаўляюць паміж сабой. У класе шумна.

Так праходзіць 45 мінут. Нарэшце з'яўляецца выкладчык па географіі. Аказваецца ФІНКЕЛЬШТЭЙН паведаміў яго, што заняткі пачнуцца ў 4 гадзіны 15 мінут.

— Сёння географія—навінка ў совпартшколе. Большасць работніц бачаць глобус і карту ў першы раз.

— Геаграфія—гэта вучэнне аб зямлі. Т ПАНЫШ расказвае слухачам як утварылася сонечная сістэма і наша планета—зямля. Лекцыя занадта зацікавіла слухачоў. Асаблівая ўвага слухачоў была прыкавана да таго месца, дзе выкладчык даказваў, што нашай зямлі 2 280 млн. год у працівазагу рэлігіі, якая тлумачыць аб тым, што зямля ўтварылася 5.500 год таму назад па „павяленню божаму“.

Т. Паныш указвае гэту тэму з сучаснасцю і апавядае далей слухачам аб тых вялікіх дасягненнях навукі, якія дае палёт стратастата „СССР“ у стратасферу і г д.

Асабліва захопліваюць слухачоў тлумачэнні настаўніка аб паходжанні жыцця на зямлі. Дзесяткі пытанняў слухачы задавалі выкладчыку.

— Яшчэ-б дзве гадзіны слухалі, заўважае работніца ПАРФЕНОВІЧ.

— У нас сёння расчыніліся вочы. Многія з нас пражылі больш паўсотні год, а не ведалі адкуль паўзяецца маланка. Зараз вы нам проста і зразумела растлумачылі—гаворыць работніца Смалькова т. Панышу.

Лекцыя па геаграфіі прыкавала да сябе вялікую ўвагу старых работніц фабрыкі «Дзвіна»—слухачоў совпартшколы.

Цяга да навукі сярод рабочых і работніц велізарнейшая.

Паказальнікам гэтага служаць першыя заняткі па географіі ў групе «Б» совпартшколы. Патрэбна толькі умелая арганізацыя заняткаў і правільны метад выкладання.

Н. ШУЛЬМАН.

На занятках па прыродазнаўстве ў совпартшколе імя Молатава.

На шчоткамбінаце прапановы праверкома не ажыццяўляюцца.

У сваіх вывадах праверком па чыстцы і праверцы партарганізацыі шчоткамбіната адзначыў зусім слабы палітычны ўзровень значнай часткі членаў і кандыдатаў партыі ў выніку таго, што партвучоба на камбінаце была пастаўлена з рук вон дрэнна. Праверком прапанаваў неадкладна разгарнуць партвучобу в тым, каб ніводзін член і кандыдат партыі, а таксама і спачуваючы не быў па за вучобай.

Пасля чысткі, прайшло многа часу. Аднак, прыходзіцца канстатаваць, што пералома па наладжванню партвучобы на камбінаце няма. Указанні праверкома паасобнымі ячэйкамі (шчотачная, МХО і ЗРК) не выконваюцца.

Два месяцы работаюць партшколы на камбінаце. Фармальна імі ахоплена 95 проц. комуністаў, аднак наведвенне вучобы нікудышнае—з 98 чалавек за заняткі наведвае толькі 55-60 чал.

Асабліва дрэнна наведваецца кандыдацкая школа. Кандыдаты ДЗЕДУШАВА, ІОФЕ А. і ШЭЙНКІНА яшчэ адразу не былі на занятках, не гледзячы на тое, што яны палітычна малапісьменныя. Аб гэтым добра ведае ячэйка шчотачнага цэха, у якой састаяць Дзедушава, Іофе і Шэйніна, але чамусці якіх мер не прынята для таго, каб прыцягнуць іх да вучобы.

Зусім правільна зрабіла бюро партканцэлярыі, калі за недаацэнку партвучобы зняла Яхвіну з работы сакратара партячэйкі шчотачнага цэха. Гэта павінна з'явіцца ўрокам для астатніх ячэек. Пастанова партканцэлярыі павінна служыць моцным папярэджаннем у павышэнні адказнасці за наладжванне партыйнай вучобы кожнай ячэйкай, кожным членам і кандыдатам партыі на камбінаце.

Разам з гэтым трэба рашуча адзначыць бяздзейнасць фабкома, які ні чога не зрабіў для таго, каб выканаць рашэнне нарады пры культпропе ЦК КП(б)Б аб перабудове партасветы ў напрамку ўцягнення беспартыйных рабочых у асобныя школы і палітгурткі. Загадчык культсектара фабкома АСІПОВІЧ пальцам аб палец не ўдарыў для таго, каб арганізаваць палітвучобу сярод беспартыйных рабочых.

Вялікім недахопам у рабоце сеткі партыйнай асветы на камбінаце з'яўляецца тое, што да гэтага часу ў школах і гуртках не ўведзены агульнаадукацыйныя прадметы (белмова, матэматыка, геаграфія).

Бюро партканцэлярыі павінна неадкладна прыняць меры з тым, каб у бліжэйшыя заняткі агульнаадукацыйныя прадметы ў сетцы партасветы камбіната былі ўведзены.

Неадкладнай, базавой задачай партыйнага калектыва шчотачнага камбіната з'яўляецца ажыццявіць наказ праверкома па чыстцы партыйнай арганізацыі, ахапіўшы вучобай усіх комуністаў не фармальна, а на справе дабіцца таго, каб кожны член і кандыдат партыі, а таксама спачуваючы акуратна, не дапускаючы ніводнага прагула наведвалі школы і палітгурткі.

Калектыўны карэспандэнт газеты „Віцебскі пролетарый „шматыражка „ШЧАТКОМБАВЕЦ“.

Усебеларускі паход за высокаякасную жывёлагадоўлю.

Зіма наступіла, ні аднэй мінуты прамаруджвання з ацяпленнем абор.

Свінні стаяць у неацепленым свінарніку.

Загадчык СТФ калгаса «Пабеда», Вялікі-лётчанскага сельсовета, Вайцэхоўскі Якуб свяёй бязгзейнасцю зрывае падрыхтоўку жывёлы да зімоўкі.

Дагэтуль свінні стаяць у неадрэмантаваным і неацепленым свінарніку. Ніякіх мер да ацяплення не прымаецца і ёсць усе пагрозы, што многа свіней, як і ў мінулым годзе, калі не будуць прынятыя меры, загінуць. Гэтага, як відаць і дабіваецца Вайцэхоўскі, які ў апошнія дні нават вусім не выходзіць на работу. Не прымае да яго мер і старшыня калгаса Багавенка.

Калгаснікі патрабуюць Вайцэхоўскага і Багавенка пакараць за бяздзейнасць, прымусіць праўленне калгаса стварыць усе ўмовы для добрай зімоўкі свіней.

Калгаснік ФІЛІМОНАЎ.



СЫТУЮ ЗІМОЎКУ—ЖЫВЁЛЕ.

Зараз-жа абсталяваць стайні.

Зараз ужо наступілі халады, а коні ў калгасе «БЯРОЗА», Вялікі лётчанскага сельсовета, асабліва ў брыгадзе № 1 ходзяць галочныя па полю. Стайні для іх не падрыхтаваны. Невядома, дзе яны будуць стаяць зімой. Старшыня калгаса ЮРЧАНКА напаўна лічыць, што не яго справа турбавацца аб становішчы конскага пагалоўя.

Праўленне калгаса павінна неадкладна ўзяцца за падрыхтоўку цёплых, належным чынам абсталяваных стайняў.

Калгаснік ХОМЧАНКА.

Каровы дрыжаць ад холада.

Не турбуе старшыню калгаса „Бяроза“, Вялікі лётчанскага сельсовета Юрчанка і загадчыка МТФ Абрамаві што каровы ў аборы дрыжаць ад холада. Абора дагэтуль яшчэ не ўцеплена, паламаны ізверы і холад дзе праз вялікія шчыліны ў сценах.

Сельсовету трэба прымусіць кіраўнікоў калгаса неадкладна зрабіць рамонт аборы. ХОМЧАНКА.

За безгаспадарчасць — да адказнасці.

У калгасе „ПАБЕДА“, Вялікі-лётчанскага сельсовета, батва і лісце гарохніны (каля 1000 пудоў), звалены ў вялікія кучы, пагнілі без усякай карысці. Старшыня калгаса Багавенка на заўвагі калгаснікаў адказаў: «У нас план сілосавання выкананы і больш сілосаваць непатрэбна».

На справе-ж план сілосавання калгасе яшчэ не выкананы. Падлікі батуры сілосных ям гаворыць аб выкананні плана ўсяго толькі на 75 проц.

Трэба за безгаспадарчасць старшыню калгаса Багавенка прыцягнуць да адказнасці.

Калгаснікі: ФІЛІМОНАЎ, ВАЙЦЭХОЎСКІ, САЎЧАНКА.

ЗАМАЦАВАЦЬ ДАСЯГНУТЫЯ ПОСПЕХІ, УЗОРНА ПАДРЫХТАВАЦЬ ГАСПАДАРКУ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ 1934 Г.

У прыгараднай гаспадарцы чыгуначнікаў „Церасполь“ у мінулым годзе ўзаралі пад зяблева ўсяго каля 100 га разам з бульбяніцкам. З пры чыны гэтага меліся вялікія цяжкасці і адставанні ў весавой сяўбе, што прывяло да нізкай ураджайнасці.

Сярод работнікаў гаспадаркі знайшліся малаверы, якія прадракалі, што ў гэтым годзе немагчыма справіцца з зяблізай ўспашкай, спасылаючыся на тое—што ад дажджоў зямля акмокла, трактарам пахаць нельга, а коні закормлены і абессілены. Але рабочы калектыў трансгаса пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі мабілізаваўся і па скаўчэнні перворвання бульбяніцка здраву была пераключана ўся рабочая сіла на зяблівую ўспашку з канём.

Цалкам сябе апраўдала прымяненне на работах індывідуальнай дзельніцы правільная расстаноўка рабочай сілы на ўчастках з такім разлікам, каб адзін пахар не перашкаджаў другому ў рабоце-вось што вырашыла поспех выканання плана. На—ударнаму ўзяліся за зяблева 18 кастрычніка. Першы дзень узаралі 7,2 га, 19 кастрычніка—9,4 га, 20/X—9 7. У сярэдзім што дзённа працавала 13 пар коней

Улічваючы слабасць коней, на касмігедзінную норму выпрацоўкі было ўстаноўлена 0,40 га. Аднак, многа рабочых ударнікаў умела працуючы з канём перавыконвалі свае нормы. Напрыклад, ШАМШУРА Ф вырабляў да 0 65 га, СЕМЕНЧУКОЎ Ц.—0,60 га, ХІТНА Л—0,55 га, БУТАКОЎ А, ВЫЛКОЎШ, КОРХЛІН Ц. выраблялі да 0,50 га ў дзень.

Па пачыну лепшых работнікаў-ударнікаў быў праведзен самакантроль за якасцю ўспашкі і па дагляду за канём. Познякоў М, які збіваў коней дротам, быў зняты з работы і аддан пад суд.

Дзякуючы гэтай ўдарнай рабоце рабочага калектыва замест 258 га па плану, па 5 лістапада было ўзарана пад зяблева 260 га, а таксама да таго ж тэрміна цалкам убрана гародніна, у тым ліку і капуста.

У гаспадарцы быў праведзен сход па пытанню аб ачыстцы ад усіх прымазаўшыхся элементаў і тых, якія недобрасумленна адносіліся да даручанай ім работы. Так, напрыклад, КАНЫШАЎ, які дрэнна адносіўся да пераборкі і хавання бульбы і коранплодаў. Сход паставіў пытанне перад адміністрацыяй аб зняцці яго з работы і прыцягнення да судовай адказнасці. Аб КЛЯЧКОВАЙ, якая была прысланая на працу ў трангас у якасці кухаркі, але замест працы яна займалася крадзяжай прадуктаў з кладовай сталоўкі і прагуламі, таксама было пастаўлена пытанне аб зняцці з работы і аддачы пад суд.

Задача рабочага трангаса ўзорнай падрыхтаванасцю да зімы замацаваць дасягнутыя поспехі і сустрэць веснавую сяўбу 1934 года поўнай падрыхтаванасцю.

ДАРЗНЕК М., БУЕВІЧ.

ФІНПЛАН.

КОМСАМОЛЬСКАЙ СОЦПУЦЁЎЦЫ ПА ФІНПЛАНУ—ШЫРОКУЮ ДАРОГУ Ў ЦЭХ, БРЫГАДУ, КАЛГАС І ВЁСКУ.

Мы ўступілі ў рашаючы этап барацьбы за поўнае выкананне гадавога фінансавага плана. Да канца года засталіся лічаныя дні—дні, рашаючыя лёс усяго народнага гаспадарчага плана першага года другой пяцігодкі і паспяховага выканання першага квартала другога года другой пяцігодкі.

Ад якасці нашай работы, правільнай расстаноўкі сіл, умення мабілізаваць актыўнасць рабочай і калгаснай моладзі на выкананне аднаго з важнейшых фактараў социялістычнага будаўніцтва—залежыць якаснае і датэрміновае выкананне фінплана чацвертага заканчваючага квартала.

На гэтым участку мы пакуль яшчэ значна адстаем ад іншых раёнаў БССР. Фінплан чацвертага квартала на 10 лістапада выкананы толькі на 41,1 проц., асабліва дрэнная справа з выкананнем плана па ўкладах у ашчадкасу. План выкананы на 25,8 проц. Недапушчальна злачынна адстаем па рэалізацыі пазыкі за наяўны разлік сярод аднаасобнікаў. План выкананы толькі на 8 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб дрэнай рабоце комсамола і беспартыйнай моладзі па рэалізацыі дагавора ўсесаюзнага спаборніцтва комсамола на лепшае і датэрміновае выкананне фінплана 4 квартала.

Віцебскі гарком комсамола заключыў дагавор на соцспаборніцтва з комсамолам Заходняй вобласці. Гэты дагавор абавязвае кожнага комсамольца арганізаваць на сваім прадпрыемстве, калгасе, брыгадзе, вёсцы соцспаборніцтва на лепшую пастаноўку работы па мабілізацыі сродкаў, з тым, каб заваяваць першынства ў гэтым спаборніцтве.

Гарком комсамола па прыкладу аршанскага комсамола выпусціў комсамольскую соцыялістычную пуцёўку па фінплану на суму 500 тысяч руб. Задача кожнай комсамольскай ячэйкі пад лозунгам падрыхтоўкі да XV гадзіны існавання комсамола Беларусі разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую і хутчэйшую рэалізацыю комсамольскіх соцпуцёвак.

Асноўнымі відамі мабілізацыі сродак павінна быць—уклады ў ашчадную касу, ахоп рабочых і калгаснікаў падпіскай на пазыку, продаж пазыкі за наяўны разлік сярод аднаасобнікаў і калектыўнае страхаванне жыцця.

Для лепшых фінударнікаў калектываў і ячэек гарком комсамола вызначыў прэміяльны фонд у суме 2000 р. і пераходны сцяг ГК КСМ.

Комсамольскія ячэйкі горада і вёскі абавязаны зараз-жа ўключыцца ў гэты конкурс-спаборніцтва на лепшае датэрміновае выкананне фінансавага плана. Мабілізуем комсамольскімі сіламі не менш 500 тысяч рублёў да 15 снежня. Ніводная ячэйка, ніводнага комсамольца не павінна застацца паза ўдзелам барацьбы за хутчэйшае выкананне фінплана. Да XV гадавіны існавання комсамола Беларусі падыйдзем са 100-процантным выкананнем квартальнага фінплана—гэта будзе лепшы падарунак.

Комсамольцы і беспартыйная працоўная моладзь, у бой за датэрміновае выкананне фінансавага плана!

САСНОЎСКІ.

Акадэмік А. САМАЙЛОВІЧ.

ТУРЭЦКАЯ РЭСПУБЛІКА.

14 лістапада ў Маскву звярнулася ўрадавая дэлегацыя СССР у Турцыі на чале з тав ВАРАШЫЛАВЫМ. Дэлегацыя знаходзілася ў Турцыі звыш двух тыдняў.

Сяброўства паміж СССР і Турцыяй, якое зарадзілася ў той час, калі абедзве краіны знаходзіліся пад пагрозай імперыялістычнай інтэрвенцыі, штодня ўмацоўваецца. Гэтае сяброўства, заснаванае на ўзаемным давер'і і прыхільных адносінах народаў абедзвюх дзяржаў, з'яўляецца ярчайшым выразам той непахіснай палітыкі міра, якую няўхільна вядзе Совецкі саюз.

Трэба адначасова адзначыць, што аб Турцыі ў нас ведаюць мала. Артыкул акадэміка А. Самайловіча, дае даволі цікавы, хаця і кароткі агляд гісторыі і сёнешніх дзён рэспубліканскай Турцыі.

У кастрычніку гэтага года суседняя і сяброўская нам дзяржава—Турцыя святкавала дзесяцігоддзе ўстанаўлення ў ёй рэспубліканскага ладу.

Сучасная Турэцкая рэспубліка стварылася пасля сусветнай вайны ў выніку тапе поспехаў напыжана-вызвалечай барацьбы 1919—1923 гадоў, у рэзультаце перамогі гэтага руха над унутранымі рэакцыйнымі сіламі, якія падтрымлівалі сярэднявяковую феадальную уладу турэцкага імператара—султана, які адначасова з'яўляўся і халіфам, г. зн рэлігійным галавою мусульман сусвітаў не толькі Турцыі, але і другіх краін. Апрача ўнутраных ворагаў, т. зн. напыжана-вызваленчы рух распавіўся да 1923 года (Лазанская канферэнцыя) з планамі яшчэ больш небяспечнага ворага знешняга—з планамі заходніх эўрапейскіх імперыялістаў, імкнуўшыхся да сусветнай вайны, у часе гэтай вайны і пасля яе захапіць Турэцкі народ з Эўропы, з Балканскага паўвострава і зрабіць сваімі калоніямі насяляемыя імі вельмі багатыя землі малай Азіі Анатоліі.

Царская Расія, яе пануючыя класы і іх урад, як і часовы ўрад Лютаўскай рэволюцыі 1917 года, былі ўдзельніка мі эўрапейскай імперыялістычнай палітыкі ў адносінах Турцыі, былі варожымі гэтай краіне.

Кастрычніцкая рэволюцыя, вызваліўшая народы СССР ад эксплоатаваўшых працоўныя масы буржуазіі і феадалаў, вызваліла тым самым і суседнюю нам Турцыю ад аднаго з яе галоўных ворагаў, ад капіталістычнай Расіі, да апошніх дзён свайго існавання не пакідаўшай мары аб падзеле Турцыі і аб заваяванні Канстантынополя. Кастрычніцкая рэволюцыя і ўстанаўленая ёю совецкая ўлада з яе новай ленінскай нацыянальнай палітыкай аказалі моцную дапамогу нацыянальна-вызваленчай барацьбе Турцыі, што прызнаецца і часта пад вярджаецца і турэцкім урадам, турэцкай грамадскасцю. Гэтыя адносіны Краіны советаў да свайго суседа на межах Каўказа і Чорнага мора паклалі пачатак сяброўству і супрацоўніцтву ў міжнародных адносінах паміж двума дзяржавамі і прывяло іх да палітычных, эканамічных і культурных сувязяй. Дагавор 1921 г. паміж РСФСР і Турцыяй адзначае „існуючую паміж імі салідарнасць у барацьбе супроць імперыялізма, роўна як і той факт, што ўсякія труднасці, створаныя для аднаго з двух народаў, пагаршаюць становішча другога. Урад рэспублікі Турцыі з'яўляецца на працягу рада год саюзнікам совецкай улады ў яе няўхільнай барацьбе за міжнародны свет.

Дарэволюцыйная Расія, будаваўшая вазунічыя планы супроць Турцыі, вывучала яе з вузкага пункта гледжання ўласных ваенных і часткова эканамічных інтарэсаў, і літаратура на расейскай мове аб Турцыі, атрымаўшая ў спадчыну СССР ад дакасірычніцкіх часоў, тэндэнцыйна, аднабакова і незадавальняла. На цэлым радзе навуковых дысцыплін Турцыя дагэтуль застаецца для совецкага грамадзяніна белай плямай. Першыя арыгінальныя (не перакладныя) падручнікі турэцкай мовы на расейскай мове з'явіліся, на прыклад, толькі ў совецкі час. Белай плямай у многіх адносінах застаецца Турцыя і для самых туркаў, так як нацыянальная навука у сучасным свеце ў гэтай краіне пачынае развівацца толькі ў рэспубліканскую эпоху, раней-жа і ў навуковых адносінах (калі не гаварыць аб мясцовай сярэднявяковай навуцы), як у адносінах палітычных, і эканамічных, Турцыя залежыла ад Заходняй Эўропы, вывучаўшай і апісваўшай Турцыю старонна ў метах яе эксплоатацыі, а не ў метах яе незалежнага і усебаковага развіцця.

З'явіўшыся пасля перамогі нацыянальна вызваленчага руха палітычна і эканамічна незалежнай, ад імперыялістаў, Турцыя, як малодая буржуазна дэмакратычная рэспубліка з культурна адсталым, пераважна селянскім насельніцтвам, з устарэўшай тэхнікай пераважаючай у краіне сельскай гаспадаркай і са слабаразвітай прамысловасцю, адчувае патрэбу для ўмацавання свайго ўнутранага і значнага становішча ў падняцці эканамічнай і культурнай магутнасці краіны шляхам налаўлення шляху эносін, машынізацыі зямляроства, удасканалення жывёлагадоўлі, развіцця прамысловасці, адчувае патрэбу ў шырокім распаўсюджванні асветы, у арганізацыі самастоянай навуковай дасведнасці, забяспечваючай самастойнае гаспадарчае і культурнае будаўніцтва.

Захаваўшы за сабою частку Балканскай паўвыспы з галоўнымі гарадамі Стамбулам і Адрыянопалем і пратокі Босфар і Дарданэльскі з Мрамарным морам паміж імі, сучасная Турцыя асноўную сваю тэрыторыю мае у Малай Азіі з морскімі межамі на Чорным і Міжземным мерах і з сухазямнымі межамі з СССР, Персіяй, Іракам, Сірыяй. Уся тэрыторыя Турцыі складае прыблізна 750.000 кв. км, а насельніцтва яе, у большасці туркі, дасягае 14 мільёнаў чалавек.

Сталіцай рэспублікі з'яўляецца г. Анкара, на малавазіцкім пласкагорці (800 м. над узроўнем мора), якая ператвараецца ў горад эўрапейскага тыпа. Анкара злучана з азіяцкім прадмесцем Стамбула чыгункай, дведзенай цапер праз гарады Кайсарыю і Сівас да гарадоў Самсуна і Чаршамба на беразе Чорнага мора. Намечан працяг гэтага шляху ад Сваса на Эрзерум, адкуль мяцца чыгуначная знасіны праз Карс з нашай мяжой. Новыя кароткія чыгуначныя лініі паабудаваны у дадатак да ранейшых і у іншых частках Анатоліі. Развіваюцца аўтаэносіны паміж гарадамі па шасейных шляхах. З моманта абвяшчэння рэспублікі да 1931 года пабудавана да 2500 км. чыгуначных шляхоў і больш 1.000 км. новых шасе. Выдаткаваны работы на правядзенні абвадняльных работ, на палову, на пабудове гразоляу і на асушэнні балот.

Не гледзячы на рад прынятых урадам мер для паляпшэння матэрыяльнага становішча сялянства, у тым ліку адмену ў 1925 г. асобага падатка «ашар» (дзесяціна), і для палепшэння сельскай гаспадаркі (падвышэнне якасці насення, стварэнне пітомнікаў для дрэву, увоз сельскіх гаспадарчых машын, барацьба са шкодніками сельскай гаспадаркі, развіццё сельгасадукацыі), становішча сялянства і сельскай гаспадаркі застаецца цяжкім.

Скліканы ў 1924 годзе ў Смірне эканамічны кангрэс прыняў рашэнні і па сельскай гаспадарцы і па прамысловасці. Да 1927 года (апошні перапіс) у Турцыі было 470 фабрык, да 1931 года іх узнікла яшчэ 1988. Для падтрымкі развіцця нацыянальнай прамысловасці уведзены павышаныя мыты на адведзеныя імпортныя вырабы, рад вырабаў заборонена да ўвозу ў краіну. За апошні час Турцыя карыстаецца ў сваім сельска гаспадарчым будаўніцтве дапамогай совецкіх спецыялістаў і совецкай прамысловасці.

Прамысловых рабочых у Турцыі было у 1913 годзе 10.975, у 1927—70.216, у 1927—250.855. Мяраючы па росце колькасці фабрык, можна заключыць, што у наступныя гады колькасць рабочых узрасла значна. Паводле пераданняму турэцкай прэсы, сярод рабочых Турцыі маюцца падпольныя комуністычныя арганізацыі.

Турцыя падзелена на 10 гандлёва-эканамічных раёнаў, кірэмых дырэктарамі. Арганізавана вышэйшы эканамічны совет. Створан рад новых банкаў. Узнікаюць кааперац. арганізацыі.

Рэспубліканскім урадам Турцыі прадпрынят рад мер для ліквідацыі перажытку феадалізма у праве, быце і культуры, з якімі не магла справіцца у канстытуцыйную эпоху млада-турэцкая партыя «Адзінства і прагрэс», якая прыйшла да ўлады з рэволюцыяй 1908 года Знішчаны манастыры і канфіскавана іх маёмасць. Адкрытыя жаночыя твары адменены абавязковае выходнае адзенне для жанчын і чырвоныя фескі з чорнымі кісткамі для мужчын. Жанчына атрымала доступ да грамадскага жыцця і права ўдзела ў сельскім і гарадскім самакіраўніцтве. Скасаван арабскі альфабет і замест яго уведзен турэцкі на лацінскай аснове. Прынят міжнародны календар і міжнароднае азначэнне лічбаў. Маецца рашэнне ад 1931 года аб пераводзе у 1933 г. на метрычную сістэму мер і вагаў. У краіне расце, хаця і павольна, колькасць школ, настаўнікаў і вучняў. Вучняў у пачатковых школах у 1923—24 г. было 343498, а у 1930—32 годзе—401614. Арганізавана барацьба па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. Заснаваны новыя вышэйшыя школы ў Анкары: сельска гаспадарчая, юрыдычная, педагагічная. Заснаваны новыя навуковыя таварыствы: антрапалагічнае, гісторычнае, лінгвістычнае і інш. Развіваецца краязнаўства. Намечана ад крыццё у 1934 г. Акадэміі навукі мастацтва і дзяржаўнай навуковай бібліятэкі ў Анкары.

Вельмі адстала развіццё вышэйшай тэхнічнай асветы.

Эканамічныя дзяржаўці значна затрымліваюць ажыццяўленне ўсеагульнай адукацыі і наогул развіццё асветы і культуры. Слаба дагэтуль абстаіць справа з прыватнасці з турэцкім тэатрам: дзяржаўнага тэатра няма, гарадскі маецца толькі ў Стамбуле. Драматычная літаратура бедная.

Наглядаецца вялікі інтарэс да культурных дасягненняў СССР і робяцца паездкі для іх вывучання.

Удзяляецца значная ўвага развіццю спорта. Як вядома, на працягу ряду год адбываюцца сустрэчы турэцкіх і совецкіх фізкультурнікаў.

Вытворчы паход імя тав. Гікало.

ПЫТАННІ АХОВЫ ПРАЦЫ — У ЦЭНТР ШТОДЗЁННАЙ РАБОТЫ ПРАФСАЮЗАЎ!

Возмем пад пільны грамадскі кантроль падрыхтоўку прадпрыемстваў і цэхаў да зімы.

Намечаныя мерапрыемствы поўнасцю рэалізаваць.

Прагучаў званок і ўсе рабочыя накіраваліся праз лесвіцу ў маленькі пакойчык раздзевальні, дзе ўжо было поўна людзей. Крык аглушаў выдавальшчыкаў, якія мітусіліся з кута ў кут. Кожны выцягваў руку, на якой балтаўся картонны талончык, крычаў, клікаў да сябе выдавальшчыка. 2 гадзіны так працягвалася. Толькі ў 5 гадзін шум сціх, вешалкі аслабаніліся ад паліто, рабочыя разыходзіліся.

— Кожны раз адно і тое-ж — гаворыць выдавальшчык, выціраючы пот з ілба. Наша вешалка разлічана на 348 паліто, а карыстаюцца ёю больш 1000. Адсюль і шум, крык. Сёння яшчэ нічога. Вось учора быў такі выпадак, што нейкі хлопец падрабіў талон (рабочы, які здае паліто, атрымоўвае картонны талончык) і атрымаў чужое паліто. Прыбегла работніца атрымаць паліто, а яго няма. Ну і было ж справу...

* * *

7 тыс. рублёў асігнавана фабрыцы «КІМ» для аховы працы. З іх выкарыстана ўсяго 4600.

Распрацаван план правядзення аздараўленчых мерапрыемстваў па фабрыцы. Сачыць за правядзеннем гэтых мерапрыемстваў ускладаецца, у першую чаргу, на грамадскіх інспектароў па ахове працы. Але на фабрыцы «КІМ» іх ніхто не ведае. Запытваемся, скажам, у работніц вязальнага цэха Абуховіч і Цомік: „Хто ў вас грамадскі інспектар па ахове працы"? Яны здзіўлена націскаюць плячыма: „Не ведаем такога".

І гэта вусім невыпадкова, бо грамадскі інспектар па ахове працы Давідаў за бяздзейнасць, халатныя адносіны да працы яшчэ два месяцы назад з гэтай працы знят. Але новага яшчэ не абралі. Старшыня фабкома Вайнштэйн не турбуецца. «Абярём яшчэ»—кажа яна. І вось ужо два месяца, як усё абіраюць.

Ужо адзін факт з непаладжаннем новай раздзевальні, якая каштавала-б вусім мала грошай, а з'эканоміла-б многа часа рабочых, гаворыць, што ні фабком, ні дырэкцыя не займаюцца пытаннем аховы працы рабочых.

Заходзім у вязальны цэх. Стаіць бак з гатаванай вадой, вакол якога так брудна, што нельга падыйсці. Побач з бакам стаіць плявацельніца (надумаліся ж людзі да такога сумяшчэння).

У швейна-кецельным цэху недастатковае асвятленне. Асабліва на працэсах сартоўкі, штопкі і кетлёўкі. Рабочыя збіраюцца ў адным месцы, большыня асвятлённым і працуюць згуртаваўшыся ўсю змену. Бакі з гатаванай вадой ёсць, але вада з іх сцякае прама на падлогу.

12 лістапада адбылася на фабрыцы нарада, дзе асабліва была падкрэслена недапушчальная антысанітарыя ў цэхах. На нарадзе былі вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы, вылучаны адказныя людзі за іх правядзенне. Але з моманта правядзення нарады нічога не змянілася. Той самы бруд, што быў у цэхах, застаўся і зараз. Загадчык швейна-кецельным цэхам Ягудзіна палец аб палец не ўдарыла, каб прывесці ў належны выгляд цэх.

Фабрыка «КІМ» мае два душы. Адзін для рабочых фарбарна-апратурнага цэха, другі—для кацельнага цэха, але памяшканні іх вельмі малыя і разлічаны ўсяго на некалькі чалавек у раз.

Зусім недапушчальная антысанітарыя ў інтэрнатах. У інтэрнаце па Вінчэўскай вуліцы (дом № 112) прыбіральшчыца Рачыцкая не выметае падлогі, сваечасова не мые іх. Рабочыя самі прымушаны выконваць гэту работу. Гатаванай вады там не бывае.

Усе гэтыя факты яскрава гавораць, што ахова працы троцкысучнага калектыва фабрыкі „КІМ" пастаўлена з рук вон дрэнна.

Неабходна зараз-жа прыняць рашучыя захады па ажыццяўленні на фабрыцы санітарнага максімума, поўнасцю выкарыстаць сродкі, адпушчаныя для аховы працы, абраць ва ўсіх цэхах грамадскіх інспектароў па ахове працы.

Намечаны план аздараўленчых мерапрыемстваў павінен быць поўнасцю рэалізаваны.

А. БРЫСКІН.

Не кампанейскі, а штодзённа займацца пытаннямі аховы працы

Больш месяца назад на агульным сходзе цэха дзіцячага паліто фабрыкі „Прафінтэрн" мяне абралі грамадскім інспектарам па ахове працы. Абралі.. і супакоіліся. Ніякай устаноўкі, ніякага кіраўніцтва я не атрымоўваю з боку фабкома і інспекцыі працы. Фабрычны ўрач ХРАМЦОЎ таксама ніколі не склікаў цэхавых грамадскіх інспектароў для гутарак.

Непаладжаў жа ў нашым цэху многа—памяшканне да зімы не падрыхтавана, з выбітых вакон дзме холад, цэх не апяляецца.

Зразумела, што наш цэх, маючы справу з ватай, найбольш пыльны. Прыбіральшчыцы, падмятаючы падлогу, да гэтага часа не брызгалі яе водай і пыл асядаў на нашы лёгкія. Я дабілася таго, што зараз гэты недахоп ужо зліквідаваны.

Яшчэ адно дасягненне мае наш цэх —гэта замена пры баках кружак для вады спецыяльным фантанчыкам у той час, як астатнія цэхі яшчэ карыстаюцца антыгігіенічнымі кружкамі.

Але і тут не ўсё добра. Смак вады ў бачках кажа аб тым, што яна не кіпяцілася, а толькі падагрэлася. Неабходна, каб медпункт штодзённа правяраў гэтую ваду, прыцягнуўшы да суровай адказнасці тых прыбіральшчыц, якія дапускаюць гэты агідны факт.

Недапушчальным яшчэ з'яўляецца і тое, што побач з фантанчыкам знаходзіцца адчынены кран з сырой вадой, якой большасцю карыстаюцца рабочыя. Але ж фабрычныя арганізацыі, як быццам занятыя другімі справамі, не звяртаюць на гэта ўвагі.

Мала гэтага—наш цэх разам з цэхам паліто мае толькі адзін агульны ручнік, які заўсёды брудны, бо іх карыстаецца каля 300 чалавек. Душ у нас вусім адсутнічае, не гледзячы на пыльнасць работы.

Я, як грамадскі інспектар, сачу за тым, каб падтрымліваць чыстату ў цэху, каб работніцы не пілі сырой вады, сачу каб работаў вентылятар, а ў выпадку астаноўкі яго даваджу да ведама ўрача.

Растлумачальнай работы ў нашым цэху сярод работніц ніякай не вядзецца—не бывае гутарак, прысвечаных санітарыі, не бывае лекцый урача аб тых ці іншых хваробах.

Трэба, каб пытанні аховы працы былі штодзённа ў цэнтры ўвагі фабрычных арганізацый, бо толькі ў гэтым выпадку мы дабіёмся нармальных умоў працы, спрыяючых выкананню прамфінплана.

БРУК.

Цэхі завода „Комінтэрн" да зімы не падрыхтаваны.

Холад у цэхах завода „Комінтэрн" не дае нам магчымасці прадукцыйна працаваць. Вокны не пашкляны, у такарным цэху адчыненая ў калідоры дзвер стварае скразнякі, асабліва ў час працы пылесоса.

Дырэктар завода ЭЛЬТЭРМАН не прымае мер да наладжання апалвання, не гледзячы на тое, што паблізу знаходзіцца лесазавод, дзе магчыма браць апілкі.

Паравая магістраль, праходзячая ў цэхах каля сцен, настолькі слабая, што нават пры яе функцыяванні не здолее абаграваць цэх. Таму зараз ліцейным цэхам адлічаюцца печкі, якія будуць пастаўлены ў цэхах. Але ці нармальнае гэта з'явішча, калі ў цэху будзе дымець і чадзіць звычайная маленькая печка?

Праўда, адміністрацыя супакойвае тым, што да новага года ліцейны цэх будзе пераведзен у новае памяшканне, але астатнія цэхі гэта-ж не нагрэе.

Надта дрэннае становішча на заводзе са спецхарчаваннем. Да гэтага месяца мы хаця і не гатаванае, але ўсё ж такі атрымоўвалі малако, а зараз і гэтага няма. Абрубшчыкі ліцейнага цэха, не гледзячы на шкодласць іх работы, амаль вусім не атрымоўваюць спецхарчавання.

Не лепш і з спецвопраткай. Гумавая падашва не прыгодна для ліцейнага цэха, бо хутка перагарае. Аоутак з пістонамі выклікае частыя абжогі ног, у выніку чаго бываюць захворванні рабочых (Вожык, Балтач). Адміністрацыя завода павінна зараз жа заняцца гэтым пытаннем.

Дырэктар завода надбайна адносіцца да пытання аховы працы. Не гледзячы на шматлікія заявы яму аб несправаўнасці душа, ніякіх захадаў з яго боку не прымаецца ў той час, як абвісаючая столь душа патрабуе капітальнага рамонта.

Адсутнічае на заводзе і вентыляцыя. У ліцейным цэху многа год пад рад стаяў папсаваны пылесос, а зараз ён убран і ў гэтым пыльным і шкодным цэху ачышчаецца паветра толькі пры дапамозе лёгку, якія таксама не справныя.

Паўфабрыкаты ў такарным цэху ўдзвлі валяцца пад вагамі, пакуль прыемшчык ВІНАКУРАЎ іх перадае ў слесарны цэх. Гэта можа прывесці да нашчасных выпадкаў, калі рабочы, несучы якую-небудзь цяжкую деталь, зачэпіцца за іх.



„Ахопім спаборніцтвам і пафасам асваення кожнага рабочага і работніцу, кожнага калгасніка і калгасніцу нашай пролетарскай краіны". (Са зварота злёта лепшых ударнікаў пры УсеЦСПС).

Грамадскага інспектара па ахове працы токарнага цэха ПАРФЕНАВІЧА ніхто ў цэху і не ведае. Сам ён, нават, паказвае «прыклад» рабочым, прыходзячы ў сталовую ў брудным выглядзе.

Незаліхіх поспехаў мы ўсё-ж дасягнулі. Гэтымі днямі па цэхам часткова ўстанавілі падвойныя рамы, у сувязі з чым правялі мыццё вакон, знятае павуціны.

Бачкі з кружкамі для гатаванай вады замянілі фантанчыкамі, прычым у ліцейным цэху, як больш буйным, фантанчык пакрылі спецыяльным чахлом з фанеры.

Выкананне прамфінплана ні ў якім разе нельга адарваць ад пытання аховы працы—вось гэтага не зразумела дырэкцыя завода „Комінтэрн".

Бюро партыйнай ячэйкі павінна рашуча ўдарыць па нежаданню дырэктара завода ЭЛЬТЭРМАНА выконваць пастанову партыі і ўрада аб ахове працы і прымусіць яго наладзіць нармальныя ўмовы для працы рабочага. Тое-ж самае яно павінна зрабіць і ў адносінах заводскага камітэта, з боку яго таксама няма патрэбнай барацьбы за ахову працы, што з'яўляецца неабходнай ўмовай для паспяховага выканання прамфінплана.

ПЛАВІНСКІ, БАРНІЛАЎ.

Па вынікаў выпуска авіяшколы Асоавіяхіма.

УПЕРАД І ВЫШЭЙ!

Акажам новаму аэраклубу максімальную дапамогу ў рабоце, уцягнем шырокія масы працоўных у аўладанне авіяцыйнай культурай.

На чацвертым безаварыйным выпуску.

Па шашы, пабудаванай толькі ў мінулым годзе, ваючым у Бешанковічы, на розных хуткасцях несліся аўтамашыны.

На 14 кілометры ўсе яны зварачвалі ўправа і значна лішэй працягвалі свой ход, бо ішлі па зямлі, якая зусім нядаўна была пагатай.

Усе машыны застанавіліся каля клуба, людзей, бадзёра саскакваючых з аўтамашын, сустракаў аркестр музыкі Н-скай авіябрыгады.

* * *

Гэта трыбутнікі прадпрыемстваў, прадстаўнікі партыйных, совецкіх і прафсаюзных арганізацый горада і ўдарнікі прыбывалі ў школу лётнікаў на ўрачысты чацверты безаварыйны выпуск вучлёгаў.

Вось прыбывае машына з пачэсным шафам паветранага флота—комсамольцамі розных прадпрыемстваў горада. Сярод прыбыўшых прадстаўнікоў—намеснік сакратара Віцебскага гаркома т. БАШМАЧНІКАЎ, старшыня ЦС Асоавіяхіму БССР — т. ДУБІНА, прадстаўнік ЦК ЛКСМБ т. ГОЛЬДМАН, памкаліт па комсамолу пры Наркамземе БССР тав. ЭЦІН, сакратар ГК ЛКСМБ тав. СТАРОБІНЕЦ.

Начальнік школы тав. МУРАТАЎ рапартуе тав. ДУБІНА:

— Школа ў поўным складзе выстраілася да смотра.

Дружным „ура" адказваюць маладыя выпускнікі і вучлёты на прывітанне тав. ДУБІНА.

IV ВЫПУСК.

Іх адзінаццаць чацвертага безаварыйнага выпуска.

Дзесяць лепшых ударнікаў вытворчасці, адзінаццаты—ударнік соцыялістычных палёў.

Двое членаў КП(б)Б, дзевяць комсамольцаў.

Лепшыя ўдарнікі. (Характарыстыкі іх вельмі кароткі, але выразны).

ЧЫЖОЎ—кандыдат партыі. Скончыў на «ОТЛИЧНО». Два разы прэміяван. Актыўны ўдзельнік у грамадскім жыцці школы, рэдактар насценгазеты.

СЕМЧАНКА — комсамолец. Рабочы фабрыкі «СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ». Скончыў на „ОТЛИЧНО". Добры масавік.

МАГЕР—комсамолец. Віцебскі рабочы. Скончыў школу на «ХОРОШО», актыўны ўдзельнік у грамадскім жыцці,

ГЛАДКІН—комсамолец. Рабочы завода імя ВАРАШЫЛАВА (Менск) Лепшы ўдарнік вучобы і грамадскай работы. Скончыў школу на „ОТЛИЧНО".

Усе пералічаныя тт. не маюць ні водзага дысцыплінарнага спагнання.

МЕТАДЫ РАБОТЫ.

Не абыяк, выпадкова гэты чацверты выпуск з'яўляецца безаварыйным.

Толькі ва ўмовах большэвіцкай барацьбы за асваенне тэарэтычных і практычных ведаў, пры ўжыванні соцыялістычных форм работы—соцспаборніцтва і ўдарніцтва далося маладым авіятарам гэтыя перамогі.

Штодзённа, па прыкладу правадзімых на прадпрыемствах зменна-сустрэчнага планавання ў школе заключаліся соцыялістычныя ўмовы на лепшае выкананне лётных практыкаванняў і асваенне вучобы.

Перад кожным правадзімым мерапрыемствам рабілася палітінфармацыя.

На старце праводзіліся гутаркі па бягучай палітыцы і вывучэнні тэхнікі.

Перад палётамі выпускалася газета «Стартоўка», якая мабілізавала вучлётаў на добрае асваенне тэхнікі палёта і безаварыйнасць яго.

ГРАМАДСКАЯ РАБОТА.

Вучлётамі адпрацавана 340 працадзён у калгасе «Прафінтэрн», Руда коўскага сельсавета.

Вялікая палітмасавая работа была праведзена ячэйкамі КП(б)Б і КСМ у Рудакоўскім сельсавеце за час сельскагаспадарчых работ бягучага года.

Наладжана работа ў 14 калгасных ячэйках Асоавіяхіма.

Сампрамсаюз быў узят на буксір па рэалізацыі білетаў VII Усесаюзнай лотарэі ТАХ.

Пры заданні 700 руб., школай было рэалізавана білетаў VII Усесаюзнай лотарэі Асоавіяхіма на суму 3.500 р.

ІНСТРУКТАР—ТАВАРЫШ ВУЧЛЁТА.

Цесная сувязь вучлётаў з інструктарска-камандным складам у вучобе і рабоце правяла гэты выпуск да безаварыйнасці.

Лепшым інструктарам ў школе з'яўляецца кандыдат партыі т. СКРАБ.

Група тав. СКРАБА не ведае ні водной паломкі, яна з'яўляецца самай прыкладнай у школе. Сам тав. СКРАБ яшчэ зусім недаўна скончыў школу лётнікаў пры ЦС ТАХ.

Тав. СКРАБАМ абучаны лепшыя ўдарнікі школы ЧЫЖАЎ, СЕМЧАНКА і МАГЕР.

Быў адзін выпадак, калі інструктарам БАХЦЕНАВЫМ была пушчана ў паветра машына без бензіна, у выніку чаго была вымушаная пасадка. Пасля гэтага група БАХЦЕНАВА, абгаварыўшы гэты агідны факт, выправілася і не адставала ад лепшай групы Скраба.

Таварыскія адносіны паміж інструктарскім складам і вучлётамі спрыялі паспяховаму аўладанню палётаў і асваенню тэарэтычных ведаў.

ПРАДПРЫЕМСТВЫ МАЛА ЎДЗЯЛЯЮЦЬ УВАГІ ШКОЛЕ.

За выключэннем Сампрамсаюза, які падараваў школе тры самалёты, фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», падараваўшай школе адзін самалёт і рэдакцыі газеты „Віцебскі пролетарый", сабраўшай сродкі на пабудову самалёта «Рабселькор Віцебшчыны», амаль ніводнае прадпрыемства горада не аказала ніякай дапамогі школе не толькі ў павялічэнні яе матэрыяльнай базы, але і ў яе паўсядзённай рабоце і вучобе.

Зусім адарван ад школы віцебскі вузел МБВ чыгункі.

За выключэннем святошных дзён, ніводзін дырэктар фабрыкі, сакратар партбюро, старшыня фабкома і сакратар ячэйкі ЛКСМБ не бываюць у школе, не арганізоўваюць наведванне школы лепшымі ўдарнікамі прадпрыемстваў, не знаёмяцца з бытам маладых байцоў—вучлётаў школы.

А перанясенне метадаў работы з прадпрыемстваў у школу яшчэ больш узняла-б якасць вучобы і аўладанне тэхнікай вучлётамі.

* * *

Умела, па-большэвіцку кіруюць школай як начальнік тав. МУРАТАЎ і чырвонаштандартны яе камісар тав. БОНДАР.

Пастаянай ЦК ЛКСМБ тт. МУРАТАЎ і БОНДАР узнагароджаны аружжам.

Тав. БАШМАЧНІКАЎ ад імя гаркома КП(б)Б вынес падзяку тт. Муратаву і Бондараву за іх адданую работу па падрыхтоўцы кадраў для маладога совецкага грамадзянскага флота, які становіцца самым моцным ва ўсім свеце.

* * *

Пад кіраўніцтвам партыі, пры дапамозе і гарачай таварыскай падтрымцы прадпрыемстваў горада школа лётнікаў, якая будзе рэарганізоўвацца ў аэраклуб, справіцца з баявой задачай, стаячай перад ёй—выпускам у бягучым годзе 100 вадзіцеляў совецкіх грамадзянскіх самалётаў.

З. БЕЛЁНЬКІ.

ЖАЛЕЗНАЙ ДЫСЦЫПЛІНАЙ МЫ ДАБІЛІСЯ БЕЗАВАРЫЙНАСЦІ.

Наш выпуск—чацверты. Першы безаварыйны. Дабіліся мы безаварыйнага выпуска выключна свядомай жалезнай дысцыплінай.

Тут я хачу падзяліцца, як мы змагаліся за безаварыйнасць.

Аснова нашага змагання—гэта соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Вось я напрыклад, увесь час вучобы спаборнічаў з вучлётам Сабірайскім Спаборнічалі на лепшую дысцыпліну, на поўнае выкананне практыкаванняў, на лепшую пасадку.

Выключную ўвагу мы ўдзялялі лепшай пасадцы. Нам многа, надзвычай многа, дапамагаў інструктар БАХЦІН (комсамолец).

Пасля кожнага палёта, ён падвадзіў з намі вынікі нашай учобы і гэта-ж было і праверкай выканання нашых соцумоў.

Памятаецца мне такі выпадак. Першая група інструктара БУДКОЎСКАГА (старшыня т. Маронаў) мела частыя паломкі. За ўвесь учэбны час у нас было восем паломак, з якіх сем зрабіла першая група. Камандванне нас мабілізавала такім вельмі цікавым метадам:

Выстраілі — памятаю—нас на чырвонай лініі перад машынамі і ўрачыста прынеслі паломаную амартызацыйную стойку. Гэту стойку паставілі перад палатай першай групы і стаяла стойка там да самага выпуска.

Пасля інструктар склікаў усю групу і абгаварыў выпадкі паломак.

Група абавязалася больш не мець ніводнай паломкі.

Пасля гэтага мы да самага выпуска не мелі ніводнай паломкі і за ўвесь час ніводнай аварыі.

Трэба адзначыць вельмі добрыя, чулыя адносіны да вучлётаў з боку камісара БОНДАРА і начальніка школы тав. МУРАТАВА.

Выпускнік-вучлёт А. ГЛАДКІ.

Пабудаваць аэраклуб у Віцебску.

За апошні год наша Віцебская Асоавіяхім арганізацыя пад кіраўніцтвам партыі дабілася баспрачных дасягненняў у пастаноўцы сярод трох пакаленняў, будаўнікоў соцыялістычнага грамадства, многагранай авіяцыйнай работы, маючай сур'ёзнае важнае значэнне ў справе авіяцыйнага будаўніцтва і ўмацавання абароны краіны.

У першай пяцігодцы мы атрымалі магутную авіяшкоду тэхніку, нам трэба зараз скарыстаць гэту тэхніку на далейшае ўмацаванне соцыялістычнай будоўлі і абароны краіны. Нам трэба гэтую тэхніку ўдасканаліць, нам патрэбна ёю аўладаць, даць для гэтага кадры.

У другой пяцігодцы перад совецкім паветраным флотам і ўсёй авіяцыйнай грамадзянскаю стаяць новыя грандыёзныя задачы—укараненне авіяцыі ва ўсе галіны народнай гаспадаркі, прыцягненне дзесяткаў новых тысяч працоўных да справы аўладання авіяцыйнай тэхнікай.

Перад працоўнымі Віцебшчыны пастаўлена задача ахапіць авіяцыйнай работай тысячы ўдарнікаў і даць у 1934 годзе не дзесятак, а сотні лётнікаў, пілотаў, планерыстаў і юных мадэлістаў.

Выкананне гэтай задачы магчыма толькі пры шырокім разгортванні работы не толькі вузкімі метадамі падрыхтоўкі кадраў з адрывам ад вытворчасці, а метадам аэраклуба, шляхам навучання без адрыва ад вытворчасці.

Гэта задача ва ўмовах Віцебшчыны выканальна

Віцебск мае моцную авіяшкоду, абсталяваную новай тэхнікай.

Нам патрэбна зараз па-дзелавому ўзяцца за перабудову гэтай авіяшколы ў аэраклуб.

Памяшканне ёсць.—Пад аэраклуб адведзена вялікае памяшканне былога клуба Дрэваапрацоўшчыкаў. Справа толькі за яго канчатковым абсталяваннем. А на гэта патрэбны сродкі.

Задача кожнага рабочага і працоўнага ўступіць у сапраўдныя члены аэраклуба і ўдзельнічаць у яго рабоце.

Задача гаспадарнікаў зрабіць свае прадпрыемствы і ўстановы юрыдычнымі членамі клуба і дапамагчы ў яго канчатковым абсталяванні.

Задача партыйных, комсамольскіх, прафсаюзных арганізацый дапамагчы аэраклубу ў падборы кадраў з лепшых перадавых ударнікаў, каб належным чынам паставіць справу з марксісцка-ленінскім выхаваннем члена клуба і разгортваннем масавай работы.

Да 15 снежня клуб павінен быць поўнасцю абсталёван і пачаць рэгулярную работу па абучэнні авіяцыйнай тэхніцы ўдарнікаў без адрыва ад вытворчасці.

1 студзеня 1934 года ў клубе будуць адчынены аддзяленні па авіямадэлізму, планерызму, парашутнай і лётнай справах.

За 1934 год аэраклуб павінен будзе ахапіць сваёй работай тысячы лепшых ударнікаў без адрыва ад вытворчасці.

Пачатак зроблен. Усе ўмовы маюцца. Задача ясна. Трэба толькі па-большэвіцку ўзяцца за работу.

Аэраклуб у Віцебску павінен быць і будзе.

Гэта банды абавязак усёй пролетарскай грамадскасці Віцебшчыны!

МУРАТАЎ.

ПАЧАТАК ЗРОБЛЕН.

Тав. Сталін, падводзячы на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) вынікі першай пяцігодкі, казаў:

— У нас не было авіяцыйнай прамысловасці, яна цяпер у нас ёсць.

Авіяцыя ў нашым Совецкім саюзе вырасла і ўмацнілася толькі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыі, пры гарачай падтрымцы шырокай пролетарскай грамадскасці нашай краіны.

Справа падрыхтоўкі большэвіцкіх кадраў для авіяцыі—гэта такое ж сур'ёзнае пытанне, як пабудова самалёта.

Віцебская школа лётнікаў імя т. Варашылава, паводле пастаноў ЦС Асоавіяхіма БССР і ЦК ЛКСМБ, перабудоўваецца ў аэраклуб. Мэтай гэтага клуба з'яўляецца—масавая падрыхтоўка і навучанне лётнай справе тысячы лепшых праверэных рабочых ударнікаў без адрыва ад вытворчасці.

10 лістапада на вечары, прысвечаным чацвертаму безаварыйнаму выпуску была склікана нарада прадстаўнікоў партыйных, гаспадарчых, прафсаюзных арганізацый прадпрыемстваў гор. Віцебска.

Начальнік школы т. МУРАТАЎ кароткa інфармаваў удзельнікаў нарады аб арганізацыі ў Віцебску аэраклуба і канкрэтна спыніўся на задачах стаячых перад грамадскасцю Віцебшчыны ў дапамозе яго арганізацыі.

На гэтай нарадзе выступіў прадстаўнік ЦК ЛКСМБ тав. ГОЛЬДМАН.

Спыняючыся на задачах аэраклуба тав. ГОЛЬДМАН адзначыў, што на прадпрыемствах павінна быць праведзена вялікая авіяпрапаганда, трэба арганізаваць рад кутковых авіяцыі і навучыць працоўную моладзь абараняць Совецкі саюз ад нападаў ворага з паветра.

Выступіўшы за тав. ГОЛЬДМАНАМ дырэктар акулярнай фабрыкі т. ГАЛУЗА узяў на сябе абавязак, за кошт фабрыкі, вытачыць для патрэб майстэрні школы 50 утулак, ашкліць новы ангар, які ў хуткім часе будзе скончан і падарыць школе 40 пар лётніцкіх акуляраў.

Прадстаўнікі завода «ЧЫРВОНЫ МЕТАЛІСТ» абавязаліся падарыць школе два варштата, якія вырабляюць на іх заводзе—тачыльна-шліфавальны і абдзірачны.

Да святкавання дня ЧЫРВОНАЙ арміі, акулярная фабрыка і завод «ЧЫРВОНЫ МЕТАЛІСТ» абавязаліся прападнесці будучаму аэраклубу вучэбны самалёт У—2.

Дырэктар абутковай фабрыкі імя ЛЕКЕРТА тав. ХАЙКІН абавязаўся даць для камандна інструктарскага і палітскладу школы 15 пар ботаў.

Тав. ХАЙКІН паведамляе, што згодна даўмоўленасці, фабрыка імя ЛЕКЕРТА, СКУРЗАВОД і арцель „ПРАГРЭС" бяруць на сябе абавязак пабудаваць для аэраклуба самалёт „ЧЫРВОНЫ СКУРНІК".

Ідучы ўперадзе па дапамозе школе, Сампрамсаюз падараваў вучлётам для арганізацыі культурнага адпачынку ПІАНІНА. Сампрамсаюз мае зараз тры сваіх самалёты і абавязаўся пабудаваць цэлае ЗВЯНО.

Панчошная фабрыка імя Клары Цэткін адпрацуе два дні ў карысць аэраклуба.

Прыкладу Сампрамсаюза, які ўступіў першым у юрыдычныя члены аэраклуба, павінны следаваць усе прадпрыемствы горада, а таксама калгасы і совгасы.

Справа членства аэраклуба—пачесная справа.

Прадпрыемствамі павінна быць разгорнута масавая работа па папуляразацыі задач аэраклуба і ўцягненні ў іх членаў клуба лепшых ударнікаў, якія будуць абучаны лётнай справе і зарты будуць стаць на абарону совецкіх межаў.

З.

ШТОДНЯ МАЦАВАЦЬ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЦЬ НАШАЙ КРАІНЫ.

На ваенных занятках (совпартшкола імя Молатава).

Дні падрыхтоўкі да 3-га злета калгаснікаў-ударнікаў ператворым у баявыя ударныя дні ЗАСЫПКІ высокаякаснага насення, большэвіцкага РАЗМЕРКАВАННЯ ураджая.

ЗАСЫПЦЫ НАСЕННЫХ І СТРАХАВЫХ ФОНДАЎ—БОЛЬШЭВІЦКІЯ ТЭМПЫ.

«Зараз у тых краях і абласцях, якія выканалі гадавы план здачы збожжа на ўсіх відах і па ўсіх сектарах, вямаю больш важнай задачы, чым стварэнне насенных і страхавых фондаў—пісала „Правда" гэтымі днямі ў перадавым артыкуле «Замацуем перамогі калгаснага лада».

Гэтае ўказанне ЦО нашай партыі цалкам і поўнасцю адносіцца і да нашага раёна, які тры тыдні назад выканаў гадавы план збожжапаставак і завяршае пастаўкі бульбы дзяржаве.

Між тым яўная большасць калгасаў і сельсоветаў раёна яшчэ не прыступіла да ссыпкі насенных і страхавых фондаў, стварэнне такім чынам надзвычайна вялікі разрыў паміж гэтым мерапрыемствам і выкананнем плана збожжапаставак, своеасаблівы перыод міжпарэ.

Рад кіраўнікоў калгасаў, накшталт ГАЎРЫЛАВА з калгаса „Дырыжабль" Рудакоўскага сельсовета, вялікія амітары свае бяздзейнасць у справе арганізацыі засыпкі насенных фондаў прыкрыць размовамі аб тым, што гарэза яшчэ не даў планаў веснавой сяўбы. Бясспрэчна, што гарэза (т. ЖУК) у справе давядзення планаў веснавой сяўбы да калгасаў пры яўляе злачынную маруднасць, але-ж гэта не можа быць ні ў якім разе перашкодай для засыпкі насенных і страхавых фондаў. Кожны добры кіраўнік калгаса ўжо зараз можа ўстанавіць патрэбу ў насенні па нормах высева Наркамзема, улічваючы пасеўныя планы гэтага года, магчымае пашырэнне пасеваў пасобных культур. Аднак, гэта, не знімае адказнасці з гарэза за тое, каб у гэтыя-ж дні кожны калгас, кожная аднаасобная гаспадарка атрымала поўны дакладны план веснавой сяўбы.

Надзвычайна пагражаючае становішча стварэцца ў нашым раёне з тэмпамі засыпкі насенных і страхавых фондаў.

У нас маюцца ўсе магчымасці для своечасовай і высокаякаснай засыпкі насенных і страхавых фондаў, між тым па маючыхся ў нас даных толькі калгасы адзінкі, як «Молат», ВЯЛІКАЛЕТЧАНСКАГА, „Правда", ЗАМАСТОЦКАГА, „Другая большэвіцкая вясна", ЕЛАГІНСКАГА, «Наер лебн», ВІЦЕБСКАГА сельсовету засыпалі насенныя фонды. У большасці ж калгасаў Віцебскага раёна яшчэ толькі прыступаюць да гэтай справы. Напрыклад, у ЬАБІНІЦКІМ сельсавеце яшчэ прыблізна трэцяя частка ўсяго ўраджаю збожжавых не абмалочана.

Многія кіраўнікі калгасаў, як напрыклад, старшыня калгаса «Чырвоны ўсход», Дрындрожык лічыць засыпаным насенны і страхавы фонд, нават, калі ў іх насенне не ачышчана, не адсартавана, не пратушчана праз трыер, а толькі злёгка правеяна, што інакш як «очковтирательством», якое грае на руку класаваму ворагу, кваліфікаваць нельга.

Перад намі некалькі жменек насення ячменя, якое засыпалася ў калгасе „Вялікая Чэрніца" ЗАМАСТОЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА. На 50 проц. насенне засмечана, перамешана з вікай, аўсом, ды і астатнія 50 проц. ячменя пратуклі і ні ў якім разе на насенне непрыгодны. А старшыня калгаса Цухаў і кладаўшчык Плешкоў хоць-бы хны, яны лічаць, што ў іх насенны фонд па «ячменю засыпецца», між тым, як іх рукамі—рукамі Пухава і Плешкова—робіцца кулацкая справа.

Або возмем калгас імя Левіна, Багаўлянскага сельсовета. Тут пра лезшыя кулацка-шкодніцкія элементы засыпаюць насенны ячмень у хаваль ні тоўстым слоем—у 1,5 метра. Ячмень грэецца і ясная справа, што праз некалькі дзён ён канчаткова страціць всю ўсхожасць.

Па заверэннях старшынь рада сельсветаў і калгасаў насенная бульба ў іх засыпана, але гэта толькі па заверэннях, а на самай справе не так. Вось напрыклад у калгасе «Сігнал», Даўжанскага сельсовета, калгаснік Званковіч бурткаў бульбу так, што салома тарчыць з-пад зямлі, не засыпаны краі буртоў. Або у калгасе фабрыкі імя Лекерта—насенную бульбу яшчэ дагэтуль трымаюць у сараях са шчылінамі. Гэтая бульба ўжо прахвачана першымі замаразкамі і зрэзумела, для насення становіцца непрыгодная. А кіраўнікі калгаса заспакоены, яны ўпэўнены ў тым, што ў іх засыпан насенны фонд бульбы. Не работа гэта, а прамое шкодніцтва!

Прыведзеныя факты прымушаюць з усёй вастрыней біць трывогу.

Сельсоветам, калгасам неабходна моцна і цвёрда запамятаць, што насенны фонд—гэта жалезны, недатыкальны фонд, што ад размеру і якасці засыпкі яго залежыць выраўнанне баявой і адказнейшай задачы—забеспячэння паспяховай веснавой сяўбы і высокага ўраджая ў будучым годзе.

ГАРЗЕМАДДЗЕЛ, ДЫРЭКЦЫЯ МТС, СЕЛЬСОВЕТЫ АБАВЯЗАНЫ Ў БАЯВЫМ ПАРАДКУ НЕАДКЛАДНА ДА ВЕСЦІ ДА ЎСІХ КАЛГАСАЎ, ДА ЎСІХ АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК даклад ныя планы веснавой сяўбы з разлікам абавязкова на пашырэнне пасеваў яравой пшаніцы, на далейшае ўкараненне яе ў нашым раёне.

Неабходна МАКСІМАЛЬНА ФАРСАВАЦЬ АБМАЛОТ ЗБОЖЖА, ПУСЦІЎЦЫ НА КРУГЛАСУТАЧНУЮ РАБОТУ ЎСЕ МАЮЧЫЯСЯ СКЛАДАНЫЯ І ПОЎСКЛАДАНЫЯ КОННЫЯ І РУЧНЫЯ МАЛАТАРНІ, забяспечваючы бесперапынную работу і правільную расстаноўку іх па калгасах.

Дажджлівае лета і восень гэтага года стварэюць вялікую небяспеку псавання насенных матэрыялаў, калі зараз-жа не будуць прыняты баявыя і рашучыя меры да СУШКІ і належнага догляду за імі.

Неабходна ШЫРОКА СКАРЫСТАЦЬ СУШКУ НАСЕННАГА ЗБОЖЖА, выкарыстоўваючы для гэтага ўсе спосабы, усе магчымасці, пачынаючы ад падвешвання і перапалачвання збожжа і інш. Трэба папярэдзіць аб неабходнасці арганізацыі самага старанага агранэхнічнага кантролю за сушкай збожжа ў сушарнях, каб не папсаваць насенне неўмелай і неправільнай сушкай. Такую сушку трэба праводзіць толькі ў выключных выпадках.

НАСЕННЫЯ ФОНДЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ УЗОРНА ЗАХАВАНЫ, як ад западкаў і ўсякай вільгаці, так і ад раскрадання. Памяшканні, куды ссыпаюць, павінны быць праверэфэцы раваны, праверана спраўнасць дахаў, сцен, падлогі, дзвярэй вакон, запраў. Пакуль яшчэ не позна трэба на хаду арганізаваць рэмонт і дзабяспячэння амбараў і кладовых.

Гатунковае насенне павінна быць цалкам захавана ад псавання і ні ў якім разе не павінна змешвацца з радавым насеннем.

Кожны калгас абавязан засыпаць разам з насеннымі і страхавыя фонды, папярэдзіць калгасы ад магчымага разбазарвання іх.

АСАБЛІВА СТРОГАЕ ХАВАННЕ ПАВІННА БЫЦЬ ЗАБЯСПЕЧАНА ДЛЯ НАСЕННАЙ БУЛЬБЫ.

ТРЭБА ВІТАЦЬ І ШЫРОКА РАСПАЎСЮДЗІЦЬ ПА ЎСЯМУ НАШАМУ РАЁНУ ІНІЦЫЯТЫВУ ВЯЛІКА ЛЁТЧАНСКАГА СЕЛЬСОВЕТА ЯКІ ЗАРАЗ РАЗАМ З ПАЛІТАДДЗЕЛАМ МТС У КАЛГАСАХ ПРАВОДЗІЦЬ МАСАВЫЯ РЭЙДЫ—ПРАВЕРКІ ЗАСЫПКІ І ХАВАННЯ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ. ТАКІЯ РЭЙДЫ ТРЭБА ПРАВЕСЦІ ВА ЎСІХ КАЛГАСАХ РАЁНА.

Наступілі самыя рашаючыя, баявыя дні засыпкі насенных фондаў. Неадкладна поўнасцю і ў першую чаргу ліквідуючы „хвасты" запазычанасці дзяржаве па бульбе, гародніне, іншых культурах, калгасы раёна абавязаны арганізаваць работу так, каб ДА 3-га РАЁННАГА ЗЪЕЗДА КАЛГАСНІКАЎ-УДАРНІКАЎ засыпка насенных і страхавых фондаў была паўсюдна месна завершана высокаякасным, ачышчаным, адсартаваным насеннем, каб да гэтага дня была праведзена суцэльная праверка якасці хавання насенных і страхавых фондаў, каб адразу-ж пасля поўнай і высокаякаснай засыпкі насенных і страхавых фондаў прыступіць да вожнай шай „гаспадарча-палітычнай кампаніі размеркавання калгасных прыбыткаў, каб пасля засыпкі насенных фондаў быў разгорнуты калгасны гандаль хлебам і бульбай. Гэтымі днямі апублікавана дырэктыва ЦК УсеКП(б) і СНК усім партыйным і совецкім органам, якая прапануе: «Паскорыць засыпку насенных і страхавых фондаў і тым даць магчымасць хутчэй пачаць і разгарнуць калгасны гандаль збожжам».

„ДРУГАЯ ЗАПАВЕДЗЬ—ЗАСЫПКА ВЫСОКАЯКАСНАГА НАСЕННЯ" павінна быць у самыя бліжэйшыя дні кожным калгасам раёна ажыццяўлена.

Правільнай, неадкладнай, высокаякаснай засыпкай насенных і страхавых фондаў, правільным большэвіцкім размеркаваннем ураджая зробім далейшы магутны крок у барацьбе за ажыццяўленне лозунга тав. Сталіна, каб зрабіць усе калгасы большэвіцкімі і усіх калгаснікаў заможнымі.

Падрыхтоўка да трэцяга ўсерабіна гадзіна калгаснікаў павінна быць адзначана поўным завяршэннем усіх відаў нарыхтовак, поўнай і высокаякаснай засыпкай насенных і страхавых фондаў.

КАЛГАСЫ СЯЛЮЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА, ЗАСЫПАЙЦЕ НАСЕННЫЯ ФОНДЫ, ЯК КАЛГАС ІМЯ КАЛІНІНА.

Ніводзін калгас у Сялюцкім сельсавеце за выключэннем калгаса імя Калініна яшчэ поўнасцю не скончыў засыпку насенных і страхавых фондаў. Ніводнага кілограма насення яшчэ не засыпалі аднаасобныя гаспадаркі сельсовета.

Прычынай такога недапушчальнага адставання з'яўляецца недаацэнка важнасці гэтай справы старшынямі калгасаў, якія гэта спусцілі на апартуністычны самацёк. Нічым іншым нельга тлумачыць тое, што па калгасах не скончан яшчэ абмалот, што ніякай планавасці ў гэтай рабоце няма.

Так, па калгасу імя Карла Маркса, 15 лістапада малацьбу зусім не вытваралі. Зусім беспадстаўна на радасць кулаку і спасылаючыся на тое, што „трава, малаціць нельга", прастаяла поўскладаная малатарня і трактар у першай брыгадзе. Трактарысты прышлі на работу толькі ў 12 гадзін, людзей для работы не было вылучана—Вось у чым была прычына, а надворе было самае спрыяючае.

Яшчэ горш у калгасе «Пабеда». Абмалот з 15 лістапада не вытваралі, у той час, як і малатарня і коні і людзі былі свабодныя. У гэты дзень малацілі збожжа толькі ў калгасах «МОПР» і імя Карла Маркса.

У выніку такіх безадказных адносін да малацьбы ў калгасе імя Карла Маркса засыпана толькі 12 цэнтнераў насеннага аўса, страхавы фонд не засыпан, ячменя засыпана 40 цнтн., бабовых—7 цэнтн. і ільнонасення—14 цэнтн., пры поўнай магчымасці даўно скончыць усю засыпку.

Улік у сельсавеце паставлен дзенна. Так, в калгаса „Пабеда" звесткі не паступаюць па 3—4 дні, дрэнна паступаюць звесткі і ад калгасаў імя Будзённага, „1 мая", імя Варашылава, „МОПР". Па гэтай прычыне сельсавет не мае магчымасці аперацыйна віраваць і падцягваць адстаючыя ўчасткі.

Гарза таксама не спяшаецца са спускам планаў веснавой сяўбы ў калгасы.

У сельсавеце ёсць усе магчымасці канчаткова ліквідаваўшы рэшткі запазычанасці дзяржаве, з поспехам правесці засыпку насенных і страхавых фондаў з тым, каб хутчэй прыступіць да размеркавання ўраджая сярод калгаснікаў. Аб гэтым красамоўна гаворыць той факт, што ў калгасе імя Калініна засыпаны поўнасцю насенныя і страхавыя фонды: Ячменя 71,1, цэнт., аўса—97,2 цэнт., гарохам—2,1 цэнт., бульбы—866 цэнт. вікі—31,9 цэнт., аўса в вікай—20 6 цэнт. Авёс у колькасці 27 47 цэнт. адсартаван поўнасцю, адсартавана і віка, завяршаецца сартоўка астатняга насення. Кол ас завяршае абмалот.

Засыпка насенфондаў па бульбе і выкананне кантрактацыйнага дагавора па здачы гародніны дала магчымасць калгасу правесці размеркаванне бульбы і гародніны па працадзнях. Калгаснікі атрымалі па 4 клг. бульбы на працадзень і 1,3 клг. гародніны. Усяго размеркавана 104 тоны бульбы.

Кожны калгаснік тут добра ведае аб колькасці зароблених працадзён, як выпрацаваных ім самім, так і членамі сам'і. Працадні па 1 лістапада вывешаны і запісаны ў працоўныя кніжкі, спісы вывешаны ў канцылярыі калгаса.

Калгас імя Калініна па засыпцы насенных і страхавых фондаў і размеркаванню ўраджая сярод калгаснікаў ідзе першым у сельсавеце.

Работаць па завяршэнні абмалота так, як калгас імя Калініна, наладзіць дасканалы ўлік і праверку працадзён засыпаць адсартаваным, добраякасным насеннем насенныя і страхавыя фонды на ўсю плошчу веснавой сяўбы—вось неадкладная задача кожнага калгаса Сялюцкага сельсовета.

О.

У насенны фонд засыпалі смецце.

Своечасовае і правільнае размеркаванне ўраджая сярод калгаснікаў за лежыць ад поўнага скончэння малацьбы і засыпкі на ўсю плошчу яравой сяўбы насенных і страхавых фондаў.

Гэтай простай гэчы ніяк не жадае зрэзмаць старшыня калгаса „Вялікая Чэрніца", ЗАМАСТОЦКАГА сельсовета, т. ПУХАЎ.

Далёка яшчэ не скончана малацьба ў калгасе. З 45 га ячменя змалочана толькі 31 га, з 61,8 га аўса толькі 15,8 з 32 га вікі абмалочана 15. Так с ма яшчэ не абмалочана 2 га гароха, 3,5 га боба, 2 га жыта.

У двух брыгадах калгаса—3 і 4 яшчэ нават і не прыступалі да малацьбы.

Характэрнай для калгаса з'яўляецца брыгада № 1, (брыгадзір Мардаўцоў). калгаснікі на малацьбу тут выходзяць у 11 гадзін дня. Многа прагулаў Калгаснік Гладчанка Стась з 1 па 15 лістапада работаў толькі два дні—5 і 6 лістапада, МІХАЙЛАВА КАЦЯРЫНА, АРЛОВА УЛЬЯНА, ШЭТЧАНКА УЛЬЯНА сістэматычна робяць прагулы. Адгэтуль і вынікае вялікі прарыў па малацьбе, які цягне за сабой зрыў засыпкі насенных і страхавых фондаў.

Кладаўшчык (член партыі) тав. ПЛЕШКОЎ у насенны фонд засыпаў смецце, збор розных культур у дзіравую кладавую і 14 лістапада яно было пакрыта першым жа снегам. І гэтым ён лічыць, што засыпаў насенне ячменя.

Такая работа па засыпцы насенных і страхавых фондаў проста грае на руку толькі класаваму ворагу, які імкнецца сарваць ураджай будучага года.

Замастоцкаму сельсовету трэба неадкладна прыняць усе меры да пескарэння засыпкі насенных і страхавых фондаў, да арганізацыі сталага і пільнага кантроля за ўсіх калгасах якасці засыпаемага насення, поўнай захаванасці яго.

За кулацкія справы, за шкодніцтва ў калгасе „Вялікая Чэрніца" Пухаў і Плешкоў у першую чаргу павінны быць сурова пакараны. ГРЫНМАН.

ЗАМЕСТ БАЯВОЙ АРГАНІЗАЦЫІ МАЛАЦЬБЫ АПАРТУНІСТЫЧНЫЯ РАЗВАЖАННІ.

Яшчэ не пачаты край малацьбы ў калгасе „ЗАМАСТОЧЧА", ЗАМАСТОЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА Дагэтуль не скончан абмалот азімага жыта. Па яравых культурах змалочана толькі тая колькасць, якая неабходна была для разліка з дзяржавай і выдачы авансаў калгаснікам па працадзнях. З 70 га аўса абмалочана толькі 14, ячменя з 38—12, гароха з 16 га,—8,5, вікі з 50 га ўсяго 4,5. Большасць вікі, складанай у стагі ГНІЕ НА ПОЛІ ЯШЧЭ І ДАГЭТУЛЬ. Яе распягвае жывёла.

Праўленне калгаса і брыгадзіры не прымаюць мер, каб хутчэй звезці з поля, падсушыць віку і абмалаціць. Затяжку ў малацьбе яны тлумачаць тым, што ўсе сілы былі перакінуты на заблізлае ворыва і пераборку бульбы. Між тым, упаўне магчыма было ды выкананні гэтых жа работ арганізаваць начную малацьбу, але праўленне калгаса не паклапацілася набыць газы. І тое, што неабходна адзначыць ў Замастоцкім сельСТ—няма газы, нават для такіх важных патрэб, як начная малацьба.

Больш тыдня, як завершана заблізлае ворыва і пераборка бульбы, а з чатырох брыгад калгаса толькі адна брыгада Гусакова арганізавала абмалот.

Гэткае грубейшае ігнараванне дырэктыў партыі і ўлады—ПРОСТЫ САБАТАЖ малацьбы в боку праўлення калгаса на чале з старшынёй Яліхавым зрываюць засыпку насенных і страхавых фондаў і хутчэйшае размеркаванне ўраджая сярод калгаснікаў.

Хопіць займацца апартуністычнымі разважаннямі, хопіць ставіць у „чаргу" выкананне важнейшых сельска-гаспадарчых работ. На малацьбу трэба зараз вінуць максімум сіл, каб мець магчымасць, засыпаўшы насенныя і страхавыя фонды, прыступіць да размеркавання ўраджая.

Калгаснік КАТЧЭНКА.

Зараз-жа арганізаваць кругласутачны абмалот.

Засыпка насенных і страхавых фондаў і размеркаванне калгасных прыбыткаў у калгасе «Бяроза», Вялікалётчанскага сельсовета, зрываецца з-за заціжкі малацьбы.

Калгас мае належную колькасць малатарань і пры жаданні малацьбу ма чыма ў самым хуткім часе скончыць, але старшыня калгаса Юрчанка не спяшаецца.

Неабходна ў гэтыя-ж дні арганізаваць кругласутачную малацьбу, каб, такім чынам, завяршыць засыпку насенных фондаў і пачаць размеркаванне ўраджая.

Калгаснік ВОСІПАЎ.

Чырвоны абоз у гонар злёта калгаснікаў-ударнікаў.

У адзнаку падрыхтоўкі да трэцяга раённага злёта калгаснікаў-ударнікаў, калгаснікі калгаса імя Калініна, Сялюцкага сельсавета, 17 лістапада арганізавалі чырвоны абоз па завяршэнні здачы прадукцыі дзяржаве в 8 падвод гародніны і 2 падвод з аўсом у разлік з МТС за вытвораны абмалот. Калгаснікі накіравалі 18 авец у лік здачы мяса за 1934 г.

Калгас імя Будзённага гэтага-ж сельсавета, накіраваў 4 падводы, колгас „Звязда"—15 падвод гародніны дзяржаве. А. СЛІКО.

Устанаўленне нармальных дыпломатычных адносін паміж СССР і ПАЗШ—новая перамога совецкай палітыкі міру.

Паведамленне Рузвельта аб паспяховым завяршэнні перагавораў.

ВАШЫНГТОН, 17. Сёння ў 16 гадз. (па амерыканскаму часу) прэзідэнт Рузвельт паведаміў прадстаўнікам друка аб паспяховым завяршэнні перагавораў. Дакументы аб прызнанні былі падпісаны ў 17 мінут папоўначы ў прысутнасці выш. абавязкі статс сакратара (міністра замежных спраў) ФІЛІПСА, міністра фінансаў ВУДЗІНА і выконваючага пасаду міністра фінансаў МОРГЕНТАЎ, а таксама БУЛІТА (спецыяльны памочнік у дзяржаўным департаменце)

На сёнешні прыём да Рузвельта з'явілася небывалая колькасць карэспандэнтаў, якія поўнасцю запоўнілі прыёмную Рузвельта ў той момант, калі ён паведаміў аб аднаўленні нармальных адносін з СССР. Рузвельт паведаміў, што напярэдадні вечарам Злучаныя штаты і Совецкі саюз прышлі да згоды аб аднаўленні нармальных адносін. Потым Рузвельт зачытаў абмен лістамі.

БУЛІТ ПРЫЗНАЧАЕЦЦА ПАСЛОМ У СССР.

ВАШЫНГТОН, 17. Паведамляюць аб тым, што БУЛІТ прызначаецца паслом у Маскву. Чакаецца згода Совецкага ўрада.

ПРАБЫВАННЕ тав. ЛІТВІНАВА Ў ВАШЫНГТОНЕ.

ВАШЫНГТОН, 18 Тав. ЛІТВІНАЎ учора быў з развітальным візітам у РУЗВЕЛЬТА і гутарыў з ім больш двух гадзін. Літвінаў меў таксама асобную гутарку ў «Белым доме» з НОРМАНАМ ДЭВІСАМ. Пасля поўдня начальнік усходня-еўрапейскага аддзела дзяржаўнага дэпартамента (міністэрства замежных спраў) КЕЛІС праводзіў тав. Літвінава ў памяшканне рускага пасольства і агледзеў яго разам з ім.

Вечарам па запрашэнні «Клуба друка» г. Літвінаў прыняў вашынгтонскіх карэспандэнтаў і рэдактараў у памяшканні клуба. Журналісты горача віталі Літвінава. Старшыня «Клуба друка» БРАНТ у сваёй прамове вітаў устанаўленне нармальных адносін паміж ПАЗШ і СССР. Брант таксама прывітаў Сквірскага па поваду яго сяброўскіх і спрыяльных адносін да вашынгтонскага друку на працягу многіх год непрызнання.

Тав. Літвінаў зрабіў заяву прадстаўнікам друка, а затым адказаў на асобныя пытанні прадстаўнікоў друка. Гэтыя пытанні выяўляюць той востры інтарэс, які існуе да многіх асобных фаз совецка амерыканскіх адносін.

Совецкія прадстаўнікі ў Вашынгтоне атрымліваюць многа тэлеграм з прывітаннямі па поваду аднаўлення нармальных адносін. Генерал ГРЭЎС, які камандаваў амерыканскай экспедыцыяй у Сібіры, прыслаў па тэлеграфу віншаванне па поваду прызнання. Сенатар БОРА паслаў тав. Літвінаву наступную тэлеграму: „Шлю шчырае віншаванне. Я чакаю ў далейшым найбольш сяброўскіх адносін паміж абодвума краінамі". БІКЕЛЬ, дырэктар агенцтва «Юнайтэд прэс», таксама прыслаў віншаванне, подобныя ж віншаванні атрыманы ад многіх іншых асоб.

Тав. Літвінаў застанецца ў Вашынгтоне ячэ на некалькі дзён.

ПАШЫРЭННЕ КРЭДЫТАЎ СОВЕЦКАМУ САЮЗУ.

ВАШЫНГТОН, 17 Тав. міністра замежных спраў ПЕЙЕР перамешчан з міністэрства замежных спраў у фінансавую карпарацыю ў якасці спецыяльнага дарадцы па замежных і экспартных справах. Надаўна Пейеру даручылі абследаваць пытанне аб гандлёвых адносінах з СССР. Як паведамляюць, карпарацыя абгаварвае пытанне аб далейшым пашырэнні крэдытаў Совецкаму саюзу.

УРАД ПАЗШ УЗЯЎ НА СЯБЕ ПАПЯЧЭННЕ АБ АРХІВАХ РУСКАГА ПАСОЛЬСТВА.

ВАШЫНГТОН, 16. З ведама совецкіх прадстаўнікоў урад ПАЗШ узяў на сябе папячэнне аб архівах рускага пасольства. Дагэтуль архівы хаваліся ў прадстаўніка Беранскага Ўгета.

ВОДГУКІ ЗА МЯЖОЙ.

ЯПОНІЯ.

ТОКІО, 18. Вячэрнія выданні ўсіх газет тэндэнцыйна публікуюць усе паведамленні амерыканскіх агенцтваў аб аднаўленні дыпломатычных адносін паміж СССР і ПАЗШ, прыводзячы кароткі змест дакументаў, якімі абмяняліся тав. Літвінаў і Рузвельт. Газеты ілюструюць гэтыя паведамленні партрэтамі СТАЛІНА, ЛІТВІНАВА, РУЗВЕЛЬТА.

ГЕРМАНІЯ.

БЕРЛІН, 18. Паведамленне аб прызнанні СССР Злучанымі штатамі стаіць сёння ў цэнтры ўвагі ўсяго германскага друку, адсунуўшы на задні план назавтра жывотрапечачыя пытанні знешняй палітыкі, якія непасрэдна датычацца Германіі. Усе газеты, за выключэннем „Фелькішэр беобахтэр" змяшчаюць паведамленне аб прызнанні на першым месцы пад вялізарнымі загалоўкамі Большасць газет не пасвяла яшчэ даць каментарыяў, так як па ведамленне аб прызнанні было атрымана тут позняй ноччу.

„ДЭЙЧЭ АЛЬГЕМЕЙНЕ ЦЭЙТУНГ" у кароткім перадавым артыкуле пад крэслівае суседнепа-гістарычнае значэнне гэтай падзеі і ўгледжвае ў гэтым значэнне ў першую чаргу ў тым, што яна акажа вялікі ўплыў на раўнаўвагу сілаў на Далёкім Усходзе. „КЕЛЬНІШЭ ЦЭЙТУНГ" падкрэслівае, што адноўлены дыпломатычныя адносіны паміж СССР і 25 дзяржавамі, у тым ліку з усімі вялікімі дзяржавамі Не прызнаўшыя СССР краіны настолькі незначны, што гэта не грае ніякай палітычнай ролі. Даўны кароткі агляд совецка-амерыканскіх адносін і падкрэсліўшы, што суседнія эканамічны крызіс і растучая напружанасць міжнародных адносін, асабліва на Далёкім Усходзе, натуральна, выклікалі зближэнне паміж СССР і Злучанымі штатамі, прычым апошнія былі асабліва зацікаўлены ў гэтым зближэнні з прычыны таго, што дзеянні Японіі пагражаюць іх жыццёвым інтарэсам, „Кельнішэ цэйтунг" у заключэнне піша: „Рузвельт можа не спярэчыся крытыкі кангрэса. Застаецца толькі жадаць, каб нармалізацыя адносін паміж гэтымі абодвума вялікімі дзяржавамі аказала суцакойваючы ўплыў як на эканамічную, так і на палітычную напружанасць на ўсім свеце".

ПОЛЬШЧА.

ВАРШАВА, 18. Увесь друк змешчае на відным месцы паведамленне з Масквы і Нью-Йорка аб прызнанні Совецкага саюза ПАЗШ. Друк даслоўна перадае тэкст лістоў, якімі абмяняліся тав. Літвінаў і Рузвельт.

ВІЦЕБСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ СЕЛЬЭЛЕКТРА ЗРЫВАЕ СКАНЧЭННЕ БУДАЎНІЦТВА ПОЛАЦКАЙ МТМ.

РЭДАКЦЫІ „ВІЦЕБСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯ".

Сканчэнне будаўніцтва Полацкай МТМ зрываецца. Віцебскае аддзяленне Сельэлектра не высылае работнікаў для мантажных работ, не гледзячы на тое, што тэрміны, паказаныя у дагаворы прашлі. Просім вашага актыўнага умешання у справу.

РЭДАКЦЫЯ „ЧЫРВОНАЙ ПОЛАЧЧЫНЫ".

***

Вось змест телеграмы, атрыманай намі 17 лістапада з Полацка.

У сваёй пастанове 6 лістапада ЦК КП(б)Б і СНК БССР патрабавалі сканчэння будаўніцтва і абсталявання Полацкай МТМ да 20 лістапада

Як паведамляе нам рэдакцыя „Чырвонай поллаччыны", Віцебскае аддзяленне Саюзсельэлектра зрывае своечасовы пуск Полацкай МТМ, не выканаўшы, згодна дагавору, работнікаў для мантажа такарных варштатаў і вытварэння сілавых установак.

Рэдакцыя „Віцебскага пролетарыя" звяртае ўвагу прэзідыума гарсовета на неабходнасць прыняцця мер да Віцебскага аддзялення Саюзсельэлектра, каб забяспечыць няухільнае выкананне пастановы ЦК і СНК па адгрэмі кіраўніцтва і будаўніцтва МТМ па сістэме Наркамзема.

БРЫГАДА ЯЎРЭЙСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ У ВІЦЕБСКУ.

18 лістапада ў Віцебск прыехала брыгада яўрэйскіх пісьменнікаў у складзе тт. КАЦОВІЧА (адк. сакратар яўрэйскай секцыі ССПП), Э. Кагана і Каменецкага.

Брыгада ставіць сваёй задачай правядзенне літаратурна масавай работы ў Віцебску і падняцце тыража часопісі „Штэрн" і газеты „Акцябр". Будуць наладжаны літаратурныя вечары ў рабочых клубах і выступленні па фабрыках і заводах.

Паведамленне рэспубліканскай камісіі па чыстцы КПБ(б).

Рэспубліканская камісія па чыстцы паведамляе, што 21 і 22-га лістапада ў г. Віцебску а 10 гадзіне ранцы будзе вяся ацэ рэспубліканская камісія па чыстцы па разгляду апеляцый на пастановы Віцебскай гарадской камісіі па чыстцы наступных таварышоў:

Альшанікава П., Мендэльсона Н І., Масл ва І І., Садовіча С. Л, Корсака ва І. В, Мельнікава Г. Ф., Калугіна Г. К, Касавера П. М., Славіна Ю А., Кулышова А. І., Саламонава Л Ф., Шолкава І. І, Левіна Д. С., Драгуна А. М., Ліора А. І., Калініікава К. Г., Бабашы скага А. А., Блізнэр Е Я., Співака М. А., Андрэеваи Т. Г., Мойжаса М. Е., Баскіра Л. І., Балваненка Е. С, Кулікоўска а В. С., Гадкіна М. Л. Маркава М. Я, Эфроса К. І. Качанова Г. А., Рэве ісава Н. Г., Кашнікавй Н. Н., Сурыцкага А К., Канпавога Д. М, Дубкіна С. С, Кабіш ара Ш Х., Багданава Г Т, Крундука П. Ф. Бугаёва Е. С., Жукава І В, Лифшца М. М, Альшэўскага П. І, Чэрняка А Л, Гаравога М. Я., Гіповіча Д. Я. Зева І. Н., Пятрова А. І., Саучанка І Л., Модель С. Н., Ліванова А. П, Грыгорэва Р. В, Васільева Л. М. Садура Ф Л, Кагана Я. Л., Шлеймовіча П. М, Шыкіна Б. А., Ляпчанскага Б. С, Кіна В. О., Мельцынай М С., Красільшчыкава Г. Ш, Петухова І В., Кімельмана Ш. Ш., Аблоўкага А. В, Сурмана Н. Д, Крыжэвіча П. П., Млечыка С. А., Гурэвіча Г. І, Будневіча Ю. Б, Фрыдмана В У., Карамана І. Л., Сідаранка П Н., Герасімава Г. П., Самусева В. Т., Лібенсона М С., Матусава І. В., Златковіча Ш. Ш., Айзерва Ф. С., Шаломовіча Х М., Левіна Д. С., Пятрова Б. Е, Цурыліна Г. К., Курнова І. М., Пульскага С. М., Ганіна І. В.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

ГАСТРОЛІ ЯЎРЭЙСКАГА ДЗЯРЖТЭАТРА УССР.

Я. ГАШЭК.

20 лістапада БРАВЫ САЛДАТ ШВЭЙК

МУЗЫЧНАЯ САТЫРА ў 3-х ДЗЕЯХ.

Пачатак у 8½ г. веч. Білеты ў касе тэатра.

ПА КАЛЕКТЫЎНЫХ ЗАЯЎКАХ СКІДКА 30 ПРОЦ.

ГАРТЭАТР (Канатная вул.) ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР НА УССР

20, 21, 22 лістапада ЗА АКЕАНАМ Я ГОРДЗІН

(КРЭЙЦЭРАВА САНАТА).

У 4-х дзеях.

Пачатак у 8½ гадз. вечара. Білеты ў касе тэатра.

ПА КАЛЕКТЫЎНЫХ ЗАЯЎКАХ СКІДКА 25 ПРОЦ.

ДЗЯРЖЦЫРК

Сёння і штодзённа вялікія цыркавыя прадстаўленні ў 3-х аддзяленнях.

Працяг гастроляў буйнейшага атракцыёна Эўрапейскага ілюзіяніста

АЛІ-ВАД

З ЯГО ГРУПАЙ АСІСТЭНТАЎ І ЛІЛІПУТАЎ.

Лепшыя эквілібрысты СССР на лесвіцы 2 ВАЙНІЦКІЯ 2

Працяг матчаў французкай прафесіянальнай

Замежны атракцыён З ДЭМОНС з і рад іншых розных нумароў.

БАРАЦЬБЫ

пад кіраўніцтвам арбітра В. М. Лебедзінскага.

Пачатак роўна ў 8½ гадзін вечара.

Каса пры цырку адкрыта з 12 да 3 і з 5 да 11 вечара. Гарадская каса—з 11 гадзін дня.

Транспартная гаспадарка Цэнтраспоть" па Гарадзенскаму шасе НАВІРАЕ 2 КАВАЛЁЎ, 6 ЦЕСЛЯРОЎ, 10 СЕЛЬГАСРАБОЧЫХ мужчын. Стаўкі па калдагаворы. Аплата вдзельная Забеспячэнне пайком, сталоўкай, кватэрай. 1068—3—1

Выгрузачна-адгрузачная кантора заходнеса „Чэп на" прызначае 20 ЛІСТАПАДА Г. Г ТАРГІ НА ПРОДАЖ ВЫБРАКАВАНЫХ КОНЯЙ

У таргах могуць прымаць удзел дзяржустановы і калгасы.

1067—1—1.

Вучэбны філіял „СОЮЗОРГУЧОТ" вытварае НАБОР ПА ВЯЧЭРНІЯ РАХУНКОВЫЯ ПЯЦІМЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 17 год з адукацыяй не ніжэй 5 груп сямігодкі. Плата за навучанне—20—25 руб. у месяц. Звяртацца: Валадарская 29 Кавптэхнікум. 1059—2—1.

ПАТРАБУЕЦЦА вялікі дыван.

Прапановы адрасаваць у кантору газеты «Віцебскі пролетарый». 1054—2—2

Згубленую трохвугольную пячатку

магазіна ТСТ № 44 лічыць несапраўднай. 1055—1—1

УСІМ ФЗМК І ЛЕКАВЫМ УСТАНОВАМ.

Аддзел соцстрата гарпрафсавета даводзіць да ведама, што на падставе пастановы УсеЦСПС і ЦСПСБ ад 16 XI г. г. урачэбна-кантрольная камісія ліквідуецца. У сувязі з гэтым функцыі УКК перадаюцца УПЭК (урачэбна-працоўнай экспертнай камісіі), якая змяшчаецца ў Палацы працы, пакой № 15

На падставе гэтай пастановы п тане аб часовай непрацаздольнасці выраішаецца наступным чынам Лекурач, які абслугоўвае застрахаваных, мае права выдаваць самастойна ў агульным складзе больнічны аркуш да 15 дзён. Пасля гэтага тэрміна і да 30 ці дзён пытанне аб часовай непрац